Радзіма більярда — Азія. Але па сцвярджэнні адных — гэта Індыя, на думку іншых — Кітай. З упэўненасцю можна сказаць адно: гульня ў мяч або шары была адной з першых, прыдуманых чалавекам. СТАР 3

За адзін прыём ежы кішэчнік здольны засвоіць прыкладна 20-30 г бялку — каля 150 г мяса ці рыбы. А калі з'едзена 300 г? Значыць, 150 г пойдуць «у справу», а астатнія 150 дастануцца кішэчным мікраарганізмам. СТАР 5

Больш за 190 чалавек з самых розных краін прынялі ўдзел у абмеркаванні актуальных пытанняў на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў». СТАР 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2013 г. СУБОТА № 79 (27444) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ТУТ ЖЫВУЦЬ НАШЫ ЛЮДЗІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў гадавіну чарнобыльскай катастрофы азнаёміўся з рэабілітацыяй пацярпелых раёнаў Беларусі, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара. Прэзідэнт наведаў Хойніцкі раён Гомельскай вобласці. Усе населеныя пункты гэтага раёна знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання. У 2012 годзе ў рамках дзяржпраграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС са сродкаў мясцовага бюджэту было накіравана ўстановам аховы здароўя Br2,3 млрд, дзяржаўная сацыяльная адрасная дапамога прадастаўлена 2,3 тыс. чалавек на суму амаль Br3 млрд.

У цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы пры наведванні Хойніцкага раёна былі пытанні развіцця аграпрамысловага комплексу і вытворчасці чыстай прадукцыі, сацыяльнай абароны насельніцтва, пацярпелага ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Прэзідэнт таксама адказаў на пытанні журналістаў.

АСНОЎНЫ ЎПОР — НА АГРАГАРАДКІ

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, нягледзячы на належную арганізацыю работ у сельгаспрадпрыемствах і добрыя валавыя паказчыкі, досыць высокай застаецца закрэдытаванасць асобных гаспадарак. «Вы нават не разлічвайце, што безгаспадарчую вытворчасць мы будзем падтрымліваць», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да губернатара Гомельшчыны Уладзіміра Дворніка.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі ёсць каля 35% гаспадарак, якія могуць высокаэфектыўна працаваць і ў поўным аб'ёме забяспечваць патрэбнасці насельніцтва ў харчаванні. Яшчэ 15-20% таксама могуць даць добры вынік і забяспечыць экспарт, калі іх яшчэ трохі падтрымаць. Што тычыцца перспектыў развіцця вёскі ў цэлым і раёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, у прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што асноўны ўпор неабходна зрабіць на аграгарадкі. «Трэба мець на ўвазе, што ў кожную вёску мы прыродны газ не правядзём, і не толькі таму, што сродкаў не хапае, гэта проста не трэба», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, такі падыход дыктуе тэхналагічнае развіццё і мадэрнізацыя аграпрамысловага комплексу, што скарачае патрэбнасць у рабочай сіле.

«Аграгарадкі і буйныя населеныя пункты мы будзем развіваць, але і так званыя неперспектыўныя вёскі мы таксама не кідаем. Там жывуць нашы людзі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Што тычыцца чарнобыльскіх раёнаў, то, паводле слоў Прэзідэнта, для іх дзяржавай ужо зроблена нямала. «Праграма іх падтрымкі захаваецца, наколькі гэта магчыма», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, што за мінулыя пасля чарнобыльскай трагедыі гады ўжо прайшлі некаторыя, месцамі неабгрунтаваныя страхі, і людзі ў гэтых раёнах разумеюць, што там можна нармальна жыць і працаваць, хоць і з пэўнымі абмежаваннямі.

АНТЫКАРУПЦЫЙНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА НЕАБХОДНА ЗРАБІЦЬ БОЛЬШ ЖОРСТКІМ

У кіраўніка дзяржавы журналісты пацікавіліся прычынамі таго, чаму ў апошні час ён даволі часта і ў жорсткай форме нагадвае чыноўнікам аб недапушчальнасці карупцыі.

«Перш за ўсё, я хачу сказаць, што не хачу, каб людзі, якія працуюць у дзяржапараце, трапілі на лаву падсудных, — адзначыў беларускі лідар. — А надаю гэтаму пытанню прыярытэтную ўвагу выключна па той прычыне, каб не дапусціць усплёску карупцыі ў краіне». Пры гэтым ён заўважыў, што карупцыйных праяў у Беларусі штогод рэгіструецца ўсё менш, пра гэта сведчаць дадзеныя пракуратуры. «Але гэта статыстыка, і ў гэтым плане мы самым жорсткім чынам не проста кантралюем, але і пытаем у чыноўнікаў. І паколькі мне было даложана аб некалькіх абуральных фактах, я вымушаны быў узмацніць барацьбу з карупцыяй. І мы падышлі да таго, што яшчэ раз вернемся да заканадаўчых актаў з мэтай узмацнення жорсткасці патрабаванняў», — заявіў Прэзідэнт.

РЫТОРЫКА АБ ЗДАЧЫ СУВЕРЭНІТЭТУ — ГЭТА ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА

Прэзідэнт не бачыць здачы суверэнітэту ў апошніх ваенных дамоўленасцях з Расіяй у сферы ўзмацнення беларускай супрацьпаветранай абароны. «Нават тыя людзі, якія кажуць, што мы тут здаём суверэнітэт, у гэта не вераць. Вы ведаеце мой характар, і толькі таму вы разумееце, што гэтага ніколі не будзе. Я не той Прэзідэнт, які будзе нешта сваё камусьці аддаваць, не кажучы ўжо пра самае высокае — суверэнітэт, бо гэта мой непасрэдны канстытуцыйны абавязак. Калі б я сказаў, што заўтра разбуру суверэнітэт і незалежнай наша краіна не будзе, вы б ніколі за мяне не прагаласавалі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца рыторыкі аб здачы суверэнітэту, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта — палітычная барацьба. «І тыя, хто сёння змагаецца супраць Лукашэнкі, яны спрабуюць яго чымсьці мазнуць, у дадзеным выпадку кажуць, што Лукашэнка здае суверэнітэт і незалежнасць. Яны самі ў гэта не вераць. Таму я нават не напружваюся па гэтым пытанні», — сказаў Прэзідэнт.

У дачыненні да дамоўленасці аб пастаўцы расійскім бокам Беларусі дадаткова некалькіх дывізіёнаў С-300 Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што падобныя комплексы ўжо стаяць на ўзбраенні ў беларускім войску, а беларуская СПА з'яўляецца самай магутнай на заходнім кірунку. «І яна ўжо не толькі беларуская, яна і Расію прыкрывае. У нас адзіная групоўка».

«І гэта не яны прыйшлі да нас. Гэта я папрасіў і патрабаваў ужо даўно, напэўна, гадоў сем таму назад, каб нам паставілі гэтыя комплексы. Калі расіяне сказалі, што гэта вельмі складана, я адказаў: добра, мы ў вас купім іх па сабекошце, пры тым — ужо былыя ва ўжыванні, мы іх самі мадэрнізуем і паставім на ўзбраенне. Нарэшце пры новым міністры абароны мне выразна сказалі: так, мы вам гэтыя некалькі дывізіёнаў С-300 паставім. Гэта значыць, мы дапаўняем нашу СПА тымі сродкамі, якія ў нас сёння стаяць на ўзбраенні. Гэта старая тэма, і я вельмі рады, што расіяне нарэшце зрабілі крок насустрач і паабяцалі нам паставіць гэтыя комплексы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэтыя комплексы не накіраваны супраць кагосьці, а з'яўляюцца выключна абарончым узбраеннем.

«Што тычыцца авіяцыйнай базы, то гэта, можа быць, проста прагучала як «база». Не, гаворка ідзе пра пастаўку ў нашы Узброеныя сілы (у якой форме, мы будзем дамаўляцца — база гэта будзе ці мы ў існуючыя беларускія часці паставім расійскія самалёты-знішчальнікі), гэтае пытанне абмяркоўваецца», — адзначыў Прэзідэнт. «Але сёння патрэбна пара дзясяткаў самалётаў, а мы купляем толькі савецкія (цяпер расійскія) самалёты Су-27 і МіГ-29, патрэбныя такія ці больш сучасныя самалёты, каб забяспечыць недатыкальнасць межаў нашай дзяржавы, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мне, як галоўнакамандуючаму, сёння не хапае двух дзясяткаў сучасных самалётаў, і то на нейкі перыяд, таму што мы тыя, якія ў нас ёсць, выведзем з часцей і мадэрнізуем у сябе — мы гэта ўмеем рабіць». «Таму тут — абарона суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны». СТАР 2

ТВОРЧЫ ТАНДЭМ З ПРЫДЗВІННЯ

Вядомы ў Верхнядзвінскім раёне краязнавец, гісторык і паэт Антон Бубала стварыў шмат прыгожых вершаваных прысвячэнняў сваёй радзіме — апаленай вайною Асвейшчыне. Некаторыя з гэтых прысвячэнняў дзякуючы самадзейнаму кампазітару і аранжыроўшчыку Ігару Новікаву ператварыліся ў песні і выконваюцца артыстамі народных калектываў, эстраднымі выканаўцамі, мясцовым хорам ветэранаў.

— Наш творчы тандэм існуе больш за дзясятак гадоў, — кажа жыхар вёскі Цінкаўцы Ігар Новікаў. — Ёсць у нашай агульнай калекцыі і лірычныя балады, і жартоўныя песні.

Ігар Новікаў жыве амаль за паўсотню кіламетраў ад райцэнтра, працуе дырэктарам музычнай школы ў пасёлку Бігосава, кіруе фальклорным калектывам «Дзвінскія напевы». Яшчэ захапляецца ігрою на старажытных інструментах — скрыпцы, гармоніку, дудзе. У вольны час з натхненнем эксперыментуе над стварэннем уласнай музыкі. Яму падабаецца творчасць паэта Антона Бубалы. Адна з апошніх сумесных работ гэтых творцаў — песня «Гэй, адгукніся!», якая палюбілася верхнядзвінцам і выконваецца на розных святах:

«Гэй, адгукніся!
Сябру руку падай,
Сонцу ўсміхніся,
З намі песні спявай!..»

На здымку: Антон БУБАЛА (злева) і Ігар НОВІКАЎ працуюць над новай песняй.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

Br4 млрд

выдзяляецца ў 2013 годзе на фінансаванне расходаў, звязаных з дзейнасцю спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на захаванне лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі, правядзенне мерапрыемстваў па выяўленні і прапагандзе творчасці маладых талентаў, арганізацыю іх навучання і стажыровак за мяжой, а таксама на набыццё музычных інструментаў, касцюмаў, матэрыялаў і абсталявання для творчых заняткаў. Таксама зацверджана рашэнне савета фонду аб выдзяленні больш як 1,53 млрд рублёў на мэты, звязаныя з захаванем і падтрымкай таленавітай моладзі.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.04.2013 г.

Долар ЗША	8660,00	▲
Еўра	11280,00	■
Рас. руб.	277,50	▲
Укр. грыўня	1063,36	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 24°
Віцебск	+ 19°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 24°
Магілёў	+ 25°
Мінск	+ 24°

«СПОНСАРСКІ» І НЕДЗЯРЖАЎНЫ

Першы на Віцебшчыне недзяржаўны дзіцячы садок можа з'явіцца ў Полацку, які нядаўна аб'яднаўся з Полацкім раёнам і стаў яго адміністрацыйным цэнтрам. А ў Віцебску ўжо ў бягучым годзе адкрыецца першы садок, будаўніцтва якога фінансуецца мецэнатамі.

Сёння вывучаецца грамадская думка наконт магчымасці адкрыцця камерцыйнай дашкольнай установы. Прагаласаваць па пытанні прапанавалі на сайце яшчэ на той час гарвыканкама. І больш за палову апытаных выказаліся за такі садок, дзе акрамя ўсяго іншага, магчыма было б індывідуальна падыходзіць да развіцця юных гараджан. Палачане, як бачым, не супраць, але іх насцярожвае агучаная інфармацыя аб тым, што плата за знаходжанне дзіцяці ў такім садку з комплексам дадатковых паслуг можа быць разоў у 10 больш, чым у дзяржаўным. І гэта як мінімум. Бо, па папярэдніх падліках, садок пачне сябе акупляць толькі тады, калі памер аплаты будзе на ўзроўні 3 мільёнаў рублёў у месяц.

Бацькі гатовы прагаласаваць рублём за недзяржаўны садок, але пры ўмове, што плата за знаходжанне там дзяцей будзе меншая.

Пытанне яшчэ і ў пошуку крыніцы інвесціравання для адкрыцця камерцыйнай дашкольнай установы. І гэта добра разумеюць як на раённым, так і на абласным узроўнях «вертыкалі» ўлады. Паводле слоў Івана Шчурка, які ўзначальвае ўпраўленне адукацыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, у аблвыканкаме падтрымліваюць ідэю з'яўлення недзяржаўнага садка. «Бо для развіцця дзіцячай дашкольнай адукацыі неабходна выкарыстоўваць усе магчымасці», — адзначыў ён, каментуючы тэму прадстаўнікам СМІ. І патэнцыйнаму інвестару пры фінансаванні стварэння садка трэба будзе зрабіць усё неабходнае, каб не былі парушаны сённяшнія нарматывы і патрабаванні, якія прадугледжаны для садкоў.

Пазіцыя кіраўніцтва мясцовай улады адназначная: і надалей будзе надавацца асаблівая ўвага адкрыццю новых садкоў і рамонту тых, што даўно пабудаваны.

Пакуль у старажытным Полацку толькі абмяркоўваецца магчымасць прыцягнення інвестыцый у галіну дашкольнай адукацыі, у Віцебску сёлета запланавана завяршэнне першага «спонсарскага» садка — пры мінімальным фінансаванні будаўнічых работ з бюджэту.

Паводле слоў старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктара Нікалайкіна, новы дзіцячы садок у адным з новых так званых «спальных» мікрараёнаў абласнога цэнтра разлічаны на адначасовае знаходжанне 230 хлопчыкаў і дзяўчынак. У свой час віцебскім прадпрыемствам рознай формы ўласнасці было прапанавана пры жаданні фінансаваць будаўніцтва садка. І адгукнулася каля 100 фірмаў, сярод якіх добра вядомае абутковае прадпрыемства «Марко». Мінімальны кошт садка, які будуецца, каля 36 мільярдаў рублёў. І больш за 1/3 частку з гэтай сумы будаўнікі ўжо засвоілі. Яны, дарэчы, і самі першымі ў краіне часткова спансіруюць будаўніцтва і пастараюцца, каб з пачаткам новага вучэбнага сезона садок быў здадзены «пад ключ».

Цікава, што некалькі спонсараў перад пачаткам дзейнасці гэтай дашкольнай установы вырашылі забяспечыць яе мэбляй, падарыць дзецям цацкі...

Улічваючы высокую сацыяльную значнасць садка, у якім маюць вялікую патрэбу жыхары мікрараёна, з бюджэту Віцебскага аблвыканкама выдзелена на яго будаўніцтва каля 20 мільярдаў рублёў. Садок-яслі, паводле слоў губернатара Віцебшчыны, запланавана здаць «пад ключ» у пачатку новага вучэбнага года — 1 верасня.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЁННЯ ДА 27 ЦЯПЛА, А Ў НЯДЗЕЛЮ ПАХАЛАДАЕ І ЧАКАЕЦЦА ДОЖДЖ

У выхадныя будзе даволі няўстойлівае надвор'е з вялікімі перападамі тэмпературы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У суботу атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы прынясуць нам амаль летнюю спякоту. Разам з тым, на большай частцы рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень 20—27 цяпла, аднак на поўначы краіны — толькі плюс 14—19 градусаў, а месцамі па Віцебскай вобласці — 10—13 цяпла.

А вось у нядзелю надвор'е істотна пагоршыцца. Паўсюдна па краіне пройдуць дажджы, удзень месцамі — моцныя ліўні і навальніцы. Пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Пахаладае. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю 8—14, на паўночным захадзе — усяго 2—7 цяпла. Удзень чакаецца не больш як плюс 9—15, па паўднёвым усходзе — 16—22, у Гомельскай вобласці — да 25 цяпла.

Не вельмі камфортнае надвор'е чакаецца і ў панядзелак, калі непрацяглыя дажджы прагназуюцца толькі ў асобных раёнах. Тэмпература паветра ўначы панізіцца ажно да 0 — плюс 6 градусаў, па паўднёвым усходзе — 7—12 цяпла. Удзень чакаецца ўжо плюс 14—18 градусаў, а па Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 18—23 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ Ў ЛІКУ ЛІДАРАЎ ПА СУБСІДЗІРАВАННІ ТАННАГА ПАЛІВА

Расія займае трэцяе месца ў свеце па субсідзіраванні нізкіх цэн на паліва. Аб'ём субсідавання нізкага кошту на паліва ў Расіі склаў 116 мільярдаў долараў. На першым месцы апынуліся ЗША з паказчыкам у 502 мільярды, а на другім — Кітай, які падтрымлівае паліўны рынак на 279 мільярдаў. Бензін у Расіі з'яўляецца самым танным у Еўропе. Паліва ў гэтай краіне каштуе менш, чым у Кітаі і ЗША. У той жа час, бензін у Расіі даражэйшы, чым у большасці нафтаздабываючых краін Персідскага заліва. Акрамя таго, калі параўноўваць не проста цэны, а суадносіны цэн на паліва і сярэдніх прыбыткаў насельніцтва, Расія прадэманструе сярэднія на свеце паказчыкі. На сярэднюю зарплату ў РФ можна купіць 869 літраў бензіну, а сярэднестатыстычны жыхар Нарвегіі (краіны з самым дарагім палівам у Еўропе) можа дазволіць сабе 1907 літраў у месяц.

РАРЫТЭТНЫЯ ПЯЦЬ ЦЭНТАЎ ПРАДАЛІ ЗА 3 МІЛЬЁНЫ ДОЛАРАЎ

Рэдкая пяціцэнтавая манета серыі Liberty Head «V», выпушчаная ў 1913 годзе, была прададзена на аўкцыёне за 3,17 мільёна долараў. Такіх пяціцэнтовікаў існуе ўсяго пяць, і яны з'яўляюцца самымі вядомымі сярод рарытэтных манет ЗША. Уладальніца прадзенай манеты, Мелва Гівенс з Салема, на працягу 41 года захоўвала манету і не выстаўляла яе на продаж, бо не лічыла яе сапраўднай. Аўтэнтычнасць манеты была ўстаноўлена толькі ў 2003 годзе. У 1992 годзе Гівенс памерла, а яе сваякі дапамаглі знайсці манету пасля таго, як нумізматычная асацыяцыя абвясціла ўзнагароду ў мільён долараў за пошук невядомага публіцы пяціцэнтовіка Liberty Head «V». Манеты наміналам пяць цэнтаў з малюнкам галавы Статуі Свабоды на адным баку і рымскай лічбай V на другім выпускаліся ў ЗША з 1883 па 1912 год. У 1913 годзе ў дызайне пяціцэнтовіка адбыліся змены: на манеце з'явілася выява галавы індзейца і бізон. Існуючыя пяць манет Liberty Head з галавой Статуі Свабоды былі адчаканены незаконна і сталі рэдкасцю.

З КІПРСКІХ БАНКАЎ ВЫВЕЛІ АМАЛЬ 2 млрд ЕЎРА ЗА МЕСЯЦ

У сакавіку аб'ём дэпазітаў, размешчаных у кіпрскіх банках, скараціўся на 3,9% (1,8 мільярда еўра) і склаў 44,6 мільярда еўра. Напэўна, маецца на ўвазе толькі той перыяд месяца, на працягу якога ўладальнікі рахункаў на Кіпры мелі доступ да сваіх сродкаў: з сярэдзіны сакавіка мясцовыя банкі не працавалі на працягу двух тыдняў. Адток сродкаў з дэпазітаў працягваецца ўжо 10 месяцаў запар, прычым тэмпы яго паступова павялічваюцца. Так, у лютым аб'ём сродкаў на рахунках у кіпрскіх банках скараціўся на 2,2%, у студзені быў зафіксаваны аналагічны паказчык. Тыя, хто выводзіў сродкі з кіпрскай банкаўскай сістэмы да сярэдзіны сакавіка, змаглі выратаваць свае зберажэнні.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗНОЙДЗЕНЫ ЦЕЛЫ ЎСІХ ЗАГІНУЛЫХ У ПАДМАСКОЎНАЙ ПСІХЛЯЧЭБНІЦЫ

Выратавальнікі знайшлі пад завалами целы ўсіх 38 загінулых у выніку пажару, які адбыўся ў ноч на 26 красавіка, у псіхіятрычнай бальніцы нумар 14 у падмаскоўным мястэчку Раменскае. Па папярэдняй версіі, большасць пацыентаў загінула ад атручвання ўгарным газам. У момант пажару амаль усе яны спалі і задыхнуліся ў сне. Вядома, што тром чалавекам (медсястры і двум пацыентам) удалося выратавацца. Раней паведамлялася пра тое, што, па словах медсястры, шпіталяваны малады мужчына падпаліў канапу ў холе, дзе пацыенты глядзелі тэлевізар. Аднак версія пра падпал не лічыцца прыярытэтнай. Пакуль расследаванне схіляецца да версій пра кароткае замыканне ці непатушаную цыгарэту. Пажарныя дабраліся да бальніцы за гадзіну, хоць павінны былі патрапіць на дарогу каля 20 хвілін. Прычына затрымкі па іх словах, у тым, што не працавала рачная пераправа. Выканаўца абавязкаў губернатара Маскоўскай вобласці Андрэй Вараб'ёў заявіў, што сваякі загінулых атрымаюць кампенсацыі ў памеры 500 тысяч рублёў.

ЯКУЮ ЭКАЛАГІЧНУЮ ПРАБЛЕМУ ВЫ ЛІЧЫЦЕ НАЙБОЛЬШ ВАЖНАЙ?

Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ, прэс-сакратар Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС:

— Для выратавальнікаў важна зніжэнне колькасці пажараў у экасістэмах. Акрамя экалагічнай небяспекі, павялічваецца выкід у атмасферу шкодных рэчываў, гінуць насякомыя, жывёла, ствараецца рэальная пагроза здароўю, жыццю і маёмасці людзей. Да таго ж тушэнне лясных і тарфяных пажараў патрабуе вялікіх чалавечых і тэхнічных рэсурсаў. Нягледзячы на тое, што з насельніцтвам праводзяцца гутаркі, шырокая растлумачальная работа праз сродкі масавай інфармацыі, праблема застаецца. Сёння моладзь выбірае здароўе і бяспеку. Так бы мовіць, «у трэндзе» тыя, хто робіць стаўку на спорт і актыўны лад жыцця. Усе хочуць жыць у экалагічна чыстым свеце. Таму мы ўскладаем вялікія надзеі на падрастаючае пакаленне, якое ў сілах паўплываць на свядомасць кожнага і ў цэлым змяніць стаўленне да навакольнага асяроддзя ў лепшы бок.

Вольга ЯНЧУРЭВІЧ, намеснік дэкана па навуковай рабоце факультэта біялогіі і экалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, кандыдат біялагічных навук:

— Захаванне рэдкіх відаў жывёл на гарадскіх тэрыторыях. Захаваць біяразнастайнасць — адна з глабальных праблем сучаснасці, і найбольш востра яна стаіць на ўрбанізаваных, г.з. гарадскіх тэрыторыях, дзе антрапагеннае ўздзеянне (чалавека) максімальнае па сваёй сіле. Буйныя гарады Еўропы адрозніваюцца тым, што найбольшая іх плошча пакрыта асфальтам і «жывыя аазісы» застаюцца толькі ў выглядзе невялікіх паркавых зон. Гарады Беларусі маюць даволі вялікі працэнт азелянення, што дазволіла жывёлам іх у належнай ступені асвоіць. Дзіўна і тое, што да цяперашняга часу на гарадскіх тэрыторыях сустракаюцца рэдкія віды жывёл. Напрыклад, у Гродне адзначаны месцы пражывання такіх рэдкіх відаў, як пустальга звычайная, грабеньчаты трытон, чаротавая жаба і некаторых іншых. І сёння наша задача ў тым, каб захаваць гэтых жывёл і стварыць ім спрыяльныя ўмовы існавання па-суседску з чалавекам.

Іяланта РАМАНОВІЧ, каардынатар Гродзенскага Орхускага цэнтра:

— Пэўна, найбольш важным у вырашэнні экалагічных праблем з'яўляецца забеспячэнне доступу грамадскасці да экалагічнай інфармацыі — поўнай, дакладнай і своечасовай. Толькі тады грамадскасць будзе эфектыўна ўдзельнічаць у працэсе прыняцця экалагічна значных рашэнняў. Менавіта ў гэтым кірунку і працуе першы ў краіне рэгіянальны Орхускі цэнтр, які створаны ў Гродне. Адна з яго задач — садзейнічанне ў экалагічнай асвеце і распаўсюджванні інфармацыі аб стане навакольнага асяроддзя, мерах па яго ахове, а таксама правах грамадскасці згодна з Орхускай канвенцыяй. У Орхускім цэнтры дапамогуць пры падрыхтоўцы зваротаў для атрымання экалагічнай інфармацыі, патлумачаць нарматыўныя прававыя акты па пытаннях навакольнага асяроддзя. Напрыклад, былі звароты гродзенцаў наконт выдалення зялёных насаджэнняў. Мы прааналізавалі закадаўчую базу і патлумачылі людзям парадак іх удзелу ў прыняцці адпаведных рашэнняў.

Падрыхтаваў Барыс ПРАКОПЧЫК.

ТУТ ЖЫВУЦЬ НАШЫ ЛЮДЗІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

РЭЖЫМ САНКЦЫЙ І ЎЛЬТЫМАТУМАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ — КОНТРПРАДУКТЫЎНЫ

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў ЕС зразумелі, што рэжым санкцый і ўльтыматумаў у дачыненні да Беларусі аказаўся не проста контрпрадуктыўным, а шкодным для самога Еўрасаюза. «Еўрапейцы пераканаліся жалезна і нашы некаторыя члены «пятай калоны» (магчыма, гэта ўжо не «пятая калона», а апазіцыянеры) зразумелі, што рэжым санкцый і ўльтыматумаў аказаўся не проста контрпрадуктыўным, а шкодным для самога Еўрапейскага саюза. Гэта меркаванне ўжо ў еўрапейцаў пераважае. Гэта я ведаю дакладна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Цяпер пытанне: як выйсці з тупіка, у які мы з еўрапейцамі трапілі? І не па нашай віне», — дадаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Еўрасаюз ставіць перад беларускімі ўладамі пытанне аб наяўнасці палітвязняў у Беларусі. «Вось і пачынаюць: там палітвязні. Я яшчэ раз кажу: мы за палітыку нікога не судзім. У нас няма палітычных артыкулаў. Крымінальшчына самая прамая. Як выйсці з гэтага становішча, я ўжо сказаў. Адыходу тут ніякага не будзе. Хто хацеў быць на свабодзе, ён сёння на волі, хто хоча быць у турме і выйсці потым героем, ну, Гасподзь з вамі, сядзіце там, няма таксама ніякіх праблем. Дзяржава вытрымае гэтых двух-трох чалавек, якія хочуць быць героямі праз турму, але ніяк не могуць зразумець, што тыя часы ўжо даўно прайшлі», — сказаў Прэзідэнт. «У нас некаторыя дзеячы даўно адтуль выйшлі. Хто пра іх цяпер што чуе, памятае іх? Ніхто», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што пытанне нават не ў палітвязнях, а ў той палітыцы, якую праводзіць Беларусь. «Нікому не хочацца вакол, каб Беларусь была незалежнай і самастойнай. Але суверэннасць Беларусі — гэта ўжо факт, які адбыўся. Мы будзем дзяржавай самастойнай і незалежнай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На яго думку, другім пытаннем з'яўляецца палітычны лад Беларусі. «Таксама камусьці не падабаецца. Разумееце, жорсткая ўлада, моцная вертыкаль — не хістаецца. Хочацца, каб галіны яе гойдаліся ў розныя бакі, хочацца, каб краіну дзялілі, і гэтая дзяльба была незалежная ад Лукашэнкі. Ну, хацець не шкодна. Можа, мы калі-небудзь выспеем да гэтага, як я ўжо казаў: ад «блакіту» да новага палітычнага ўладкавання», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «А пакуль мы лічым, што для нашай краіны пажадана мець такі лад», — адзначыў ён. «Ну і потым, вы ж разумееце: каму патрэбен у цэнтры Еўропы канкурэнт? Вось, хацелася б, як у Грэцыі ці яшчэ дзе-небудзь, каб усе нахіліліся, каб мы крылы апусцілі, а яны б пастаўлялі прадукцыю. А дзе грошы ўзяць, каб разлічыцца? Вы гэтага хочаце? Я не хачу», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «з еўрапейцамі ідзе працэс». «Мы ім прама сказалі: наша палітыка абсалютна празрыстая, мы не хочам сварыцца з еўрапейцамі, мы частка Еўропы, больш за тое — геаграфічны цэнтр. Мы хочам быць у нармальных адносінах з еўрапейскімі дзяржавамі», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Хочаце — будзем размаўляць, не хочаце — ну што ж, тады будзем чакаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

ВОЛАТ — СУР'ЁЗНА ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Адно з пытанняў, зададзеных журналістамі, датычылася сусветнага хакейнага чэмпіянату, які адбудзецца ў Мінску праз год. У прыватнасці, у Прэзідэнта спыталі, ці падабаецца яму мянушка Волат, якую далі зубру — талісману чэмпіянату. «Імя вельмі падабаецца. Волат — асілак — гэта моцная беларуская назва, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Гэта сур'ёзна для Беларусі».

Што да мастацкага афармлення талісмана, то Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што з'яўляецца невялікім спецыялістам у гэтым плане. «Галоўнае, каб ён падабаўся вам», — сказаў ён. Прэзідэнт лічыць, што калі людзям падабаецца гэты сімвал, то яго можна афіцыйна сцвярджаць. «У мяне цвёрдага, пэўнага меркавання, шчыра кажучы, няма. Я доўга думаў, але ніяк не магу зразумець, як пагляджу на гэтыя рогі, для чаго яны, што яны будуць сімвалізаваць? Лішнюю агрэсіўнасць ці гэта нам, мужыкам, намёк?» — сказаў Прэзідэнт. «Але калі людзям падабаецца, я згодны, хай зубр будзе нашым сімвалам», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

СТВОРАНА ДЗЯРЖКАМІСІЯ ПА КАНТРОЛІ ЗА ПАДРЫХТОЎКАЙ І ПРАВЯДЗЕННЕМ УСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ

У Беларусі створана дзяржкамісія па кантролі за падрыхтоўкай і правядзенні ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ ў 2013 годзе. Адпаведны ўказ № 207 «Аб арганізацыі ўступнай кампаніі ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2013 годзе» 25 красавіка прадпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Дакументам створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2013 годзе. У склад камісіі ўключаны члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і работнікі кантралюючых органаў», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Камісія павінна забяспечыць кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, іншых форм уступных іспытаў, прадастаўленнем абітурыентам роўных магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прымаць меры па ўстараненні выяўленых парушэнняў нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць арганізацыю і правядзенне прыёму, ажыццяўляць прыём грамадзян па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, а таксама забяспечваць асвятленне работы камісіі ў сродках масавай інфармацыі.

Гэты ўказ забяспечыць выкананне заканадаўства пры падрыхтоўцы і правядзенні ўступных іспытаў і залічэнні абітурыентаў ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

«Указ прыняты ў мэтах прадастаўлення гармадзянам роўных магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і забеспячэння кантролю за падрыхтоўкай і правядзеннем уступных іспытаў», — адзначылі ў прэс-службе.

■ Парламенцкі дзённік

Чалавечы патэнцыял плюс тэхналогіі і навацыі

Учора адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоля РУБІНАВА са спікерам Парламента Рэспублікі Сінгапур Халімой Якоб.

— Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць нашых краін, у нас ёсць шмат кропак судакранання, — заўважыў Старшыня Савета Рэспублікі. — У нас, мне здаецца, шмат агульнага ў падыходах ва ўнутранай і знешняй палітыцы, у тым, як мы будуем свае дзяржавы. Бо Рэспубліка Сінгапур пачынала сваё ўзыходжанне з дастаткова нізкага ўзроўню і дасягнула незвычайных поспехаў у апошнія дзесяцігоддзі. Гэты поспех адбыўся таму, што вялікая ўвага была нададзена чалавечаму фактару, бо ў краіне няма іншых прыродных багаццяў, а галоўным багаццем з'яўляецца чалавек.

У Беларусі «гэтакі ж прыцэл», сказаў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Яна таксама не мае значных прыродных рэсурсаў, таму асноўную стаўку робіць на людзей, і пытанні сацыяльнага забеспячэння тут знаходзяцца ў цэнтры ўвагі дзяржаўнай палітыкі. За апошнія гады нам таксама ўдалося дасягнуць пэўнага прагрэсу: па індэксе чалавечага развіцця Беларусь узнялася на 15 пазіцый і ўвайшла ў лік першых 50 краін у адпаведным рэйтынгу ААН.

— Нам ёсць чаму павучыцца ў Сінгапура, — прызнаў Анатоль Рубінаў. — Вы зараз на 2-м месцы ў свеце па вытворчасці ВУП на душу насельніцтва — гэта вялізнае дасягненне.

Спадарыня Халіма Якоб пагадзілася, што Беларусь і Сінгапур аб'ядноўвае адсутнасць уласных нафты і газу, пры гэтым Сінгапур вымушаны яшчэ і цалкам імпартаваць харчаванне для сваіх патрэб. «Сінгапур сапраўды робіць вялікі акцэнт на развіццё чалавечых рэсурсаў, — пацвердзіла яна. — Для краін, дзе няма прыродных багаццяў, не існуе іншай альтэрнатывы — ім прыходзіцца залежаць ад чалавечага патэнцыялу, тэхналогій і навацый».

Халіма Якоб таксама лічыць, што ў Беларусі і Сінгапуры ёсць шмат галін для ўзаемнага супрацоўніцтва. Пацвярджэннем таму стаў плённы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Сінгапур. Падчас візіту было падпісана 6 мемарандумаў аб узаемаразуменні ў сферы бізнесу і два важныя пагадненні, якія тычацца афіцыйных стасункаў і ліквідацыі двайнога падаткаабкладання.

— Разам з тым, трэба развіваць супрацоўніцтва не толькі паміж парламентамі і ўрадамі, але паміж людзьмі — каб вандроўкі ў Беларусь і Сінгапур сталі звычайнай справай для абодвух народаў, — сказала Халіма Якоб. — Мы вітаем супрацоўніцтва на ўсіх узроўнях.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ЧАМУ НЕРУХОМАСЦЬ НЕ «РУХАЕЦЦА»?

У Віцебскай вобласці летась былі ўключаны ў гаспадарчы абарот 268 аб'ектаў нерухомасці. На жаль, не забяспечана выкананне графікаў уключэння ў гэты абарот маёмасці ў большасці раёнаў.

За перыяд дзеяння адпаведнага прэзідэнцкага ўказа на тэрыторыі вобласці было прададзена па цане, роўнай адной базавай велічыні, каля 180 аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца. Але сёння новымі ўласнікамі па-ранейшаму не выкарыстоўваецца больш за палову набытых аб'ектаў. Асобныя з іх — на працягу 3-4 гадоў пасля набыцця, працягваюць разбурацца.

Пры гэтым з боку дзяржаўных органаў, абавязаных ажыццяўляць кантроль за выкананнем умоў продажу, не прымаюцца належныя меры па вяртанні аб'ектаў у камунальную ўласнасць.

Пры абследаванні аб'ектаў было ўстаноўлена, што фактычна не прыступалі да зносу будынка школы ў вёсцы Гарбаціца Ушацкага раёна. Пры гэтым аб'ект быў спісаны да завяршэння работ па яго разборцы. Таксама не былі праведзены работы па кансервацыі амаль што паловы з абследаваных аб'ектаў, у дачыненні да якіх райвыканкамам былі прыняты адпаведныя рашэнні. Больш за тое, гэтыя работы па шэрагу аб'ектаў і не маглі быць выкананы па прычыне іх частковага разбурэння. Такім чынам, меры па кансервацыі і спісанні былі прыняты толькі на паперы. Аналагічныя факты ўстаноўлены ў Сенненскім, Чашніцкім, Лёзненскім, Мёрскім і Шумілінскім раёнах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Вынікае са звароту Прэзідэнта

МЕНШ ЗАТРАТ, БОЛЬШ ЗРУЧНАСЦІ

Губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура і міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Нічкасаў азнаёміліся з ходам мадэрнізацыі адкрытага акцыянернага таварыства «Салігорскі домабудаўнічы камбінат».

На прадпрыемстве ажыццяўляецца інвестыцыйны праект па мадэрнізацыі і тэхнічным перазбраенні вытворчасці сценавых жалезабетонных канструкцый. Першапачаткова планавалася закончыць рэканструкцыю ў 2010 годзе. Са згоды кіраўніка дзяржавы завяршэнне праекта перанесена на 2013 год.

«Кіраўнік дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу акцэнтаваў увагу на тым, што пры мадэрнізацыі прадпрыемстваў нам не хапае паскарэння. Салігорскі домабудаўнічы камбінат — наглядны прыклад таго, як не трэба працаваць у гэтым кірунку. Камбінат атрымаў дзяржаўную падтрымку для мадэрнізацыі вытворчасці. А цяпер трэба як мага хутчэй запускаць новую лінію і зарабляць грошы для далейшага развіцця. Мадэрнізацыя — гэта бесперапынны працэс. Каб быць канкурэнтаздольным, трэба ўвесь час працаваць над скарачэннем затрат, што ўрэшце паўплывае на заработную плату калектыву, якая ў два разы менш, чым сярэдняя па Салігорску», — падкрэсліў Барыс Батура.

На думку кіраўніка цэнтральнага рэгіёна, прычыны адставання — у дзейнасці самога калектыву і кіраўніцтва камбіната. Тое, што ўжо зроблена па мадэрнізацыі, дазваляе ў маі пачаць будаваць дамы новай серыі. Што тычыцца другой чаргі праекта — гэта не вызначальны фактар, работы тут можна весці паралельна, за кошт асабістых зароблены сродкаў. «Мы сёння так і дамовіліся. Да канца мая новая лінія павінна ўжо працаваць на будаўніцтва якаснага жылля», — адзначыў ён.

«Запуск новай лініі дазволіць узводзіць дамы новага пакалення і зменшыць страты цяпла ўдвая. Сёння гэта вельмі актуальна, паколькі ў нашай краіне для патрэб жыллёвага фонду выкарыстоўваецца 35 працэнтаў энергіі. Акрамя таго, гэта добрая магчымасць для змяншэння затрат па аплаце камунальных паслуг», — лічыць міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Нічкасаў.

Разам з тым, міністр адзначыў, што домабудаўнічы камбінат працуе слаба: на 40% ад дзеючай магутнасці. Дзяржаўная падтрымка аказана як Мінскім аблвыканкамам, так і Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. Прадпрыемству трэба хутчэй набраць паскарэнне і пачаць выпуск новай прадукцыі, якая будзе выкарыстоўвацца як у Салігорску, так і ў іншых рэгіёнах краіны пры будаўніцтве дамоў новай серыі. Іх канструктыўныя рашэнні прадугледжваюць большыя зручнасці для жыхароў і сучасную архітэктуру. Акрамя таго, ставіцца задача актывізаваць экспарт новых вырабаў. Чакаецца, што прадукцыю, выпушчаную на новай лініі, будзе набываць Расія.

Усяго ж сёлета на Міншчыне павінна быць мадэрнізавана каля 400 прадпрыемстваў, у тым ліку 54 — рэспубліканскай формы ўласнасці. «Работы вядуцца нармальна, у адпаведнасці з графікам», — канстатаваў губернатар.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЗАТРЫМАНЫ КАРУПЦЫЯНЕР

Супрацоўнікі КДБ затрымалі намесніка міністра спорту і турызму Беларусі Сяргея Нерада, паведамілі БЕЛТА ў Камітэце дзяржбяспекі.

«У межах рэалізацыі мерапрыемстваў па супрацьдзеянні карупцыі і абароне эканамічных інтарэсаў дзяржавы Камітэтам дзяржаўнай бяспекі затрыманы намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Сяргей Нерад», — сказалі ў КДБ.

У дачыненні да Сяргея Нерада заведзена крымінальная справа па ч.3 арт.430 КК (атрыманне хабару службовай асобай, якая займае адказную пасаду), праводзяцца следчыя дзеянні.

ЗБІРАЕШСЯ НА ПОЕЗД — ЗВЕРСЯ З РАСКЛАДАМ

Чыгунка абвясціла, як будуць курсіраваць паязды рэгіянальных ліній эканом-класа ў першай палове мая.

Так, на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Барысаў — Орша, Мінск — Баранавічы — Брэст 1, 5, 12, 14 мая яны будуць хадзіць як па нядзелях. На гэтых жа ўчастках 4, 9-11 мая паязды будуць курсіраваць як па суботах. На ўчастках Мінск — Асіповічы — Бабруйск, Маладзечна — Гудагай, Маладзечна — Круляўшчызна — Полацк, Маладзечна — Ліда, Орша — Лепель 1, 4-5, 9-12 і 14 мая паязды рэгіянальных ліній эканом-класа будуць хадзіць як па выхадных.

Таксама дадаткова прызначаюцца паязды рэгіянальных ліній эканом-класа: 30 красавіка, 8 і 13 мая — Мінск — Уша — Мінск адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 15.07 (са станцыі Уша — у 16.55); Мінск — Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 16.09 (са станцыі Аляхновічы — у 18.10); Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 22.35; Мінск — Стоўбцы — Мінск адпраўленнем з прыпыначнага пункта Інстытут культуры ў 16.44 (са станцыі Стоўбцы — у 18.43); 8, 10 і 13 мая — Мінск — Баранавічы — Брэст адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 15.38.

Сяргей РАСОЛЬКА.

САМЫ ЧАС РЫХТАВАЦЦА ДА... ЗІМЫ

У Гродне павялічваюць аб'ёмы работ па адным з важнейшых кірункаў эканоміі энергарэсурсаў — уцяпленні жылля.

Сёлета ў жылых дамах абласнога цэнтра плануецца ўцяпліць 48 тысяч квадратных метраў тарцавых сцен. Гэта на 9 тысяч квадратных метраў больш у параўнанні з мінулым годам. Паводле папярэдніх разлікаў, затраты на выкананне работ па ўцяпленні складуць больш за 34 мільярды рублёў — гэта сродкі, што выдзяляюцца на капітальны рамонт жылога фонду, а таксама дадатковае фінансаванне з бюджэту.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КУДЫ ВЕЗЛІ ЎГНАЕННІ?

У Расонскім раёне супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі 2 грузавыя аўтамабілі з паўпрычэпамі, у якіх перавозіліся мінеральныя ўгнаенні — каля 40 тон коштам больш за 27 мільёнаў рублёў.

Вадзіцелі фур прад'явілі супрацоўнікам фінансавай міліцыі дакументы, згодна з якімі мінеральныя ўгнаенні належалі сялянска-фермерскай гаспадарцы. А перавозіліся калійныя ўгнаенні чамусьці ў закінутую вёску Забалоцце Полацкага раёна, што недалёка ад мяжы з Расіяй.

На самой справе, як высветлілася, гаспадарка, створаная ў 2009 годзе, практычна не ажыццяўляла ніякай дзейнасці. Адзіная здзелка адбылася ў канцы 2011 года і была звязана з набыццём 140 тон угнаенняў.

Як мяркуюць прадстаўнікі фінансавай міліцыі, мінеральныя ўгнаенні незаконна перавозіліся на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі для наступнай рэалізацыі.

Груз канфіскаваны. У дачыненні да віцебскага прыватнага прадпрыемства, якое ажыццяўляла транспарціроўку ўгнаенняў, распачаты адміністрацыйны працэс.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗБЕГ З АПТЭКІ З КОШЫКАМ КАСМЕТЫКІ

У Мінску міліцыянеры ўстанавілі асобу і затрымалі падазронага ў рабаванні аптэкі. Зладзюжка ўкраў адтуль... кошык з касметыкай.

Пра здарэнне ў Савецкі РУУС паведаміла прадавец-кансультант аптэкі па вуліцы Багдановіча. Высветлілася, што ў сярэдзіне дня сюды зайшоў мужчына, які цягам гадзіны ў гандлёвай зале выбіраў розную касметыку. Пры гэтым ён актыўна кансультаваўся з прадаўцамі. Як толькі кошык напоўніўся, мужчына накіраваўся да кас, прычым выбраў тую з іх, якая размяшчалася бліжэй да выхаду. Пастаяў каля яе нейкі час, а потым раптам... кінуўся да выхаду і выскачыў на вуліцу. Прадаўцы спрабавалі дагнаць зламысніка, але той хутка знік з поля іх зроку. Злодзеем аказаўся 28-гадовы нідзе не працуючы, раней судзімы мінчанін. Ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Праводзіцца праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Гучная справа

АБРАБАВАННЕ ЛЮБАНСКАГА БАНКА РАСКРЫТА

Раскрыты разбойны напад на аддзяленне Белаграпрамбанка ў горадзе Любань Мінскай вобласці, учынены 21 красавіка, паведаміў начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Павел Траулька, перадае БЕЛТА.

Падазраванымі аказаліся трое маладых людзей: адзін 1991-га і двое 1990 года нараджэння. Арганізатар з'яўляўся супрацоўнікам дэпартамента аховы МУС і нёс службу ў гэтым аддзяленні банка. Ён ведаў, як адключаецца сістэма аховы і відэаназірання і загадзя зрабіў дублікаты ключоў ад банкаўскіх памяшканняў. Зламыснікі пракраліся ў гаражнае памяшканне банка ў 4 гадзіны раніцы і прабылі там да вечара. Затым яны праніклі непасрэдна ў памяшканне банка, адключылі сігналізацыю і камеры. Пасля гэтага абясшкодзілі ахоўніка і забралі ў яго пісталет Макарава. Пад пагрозай зброі яны запатрабавалі ў касіра аддаць ім грошы, якія знаходзіліся ў касе, пасля чаго звязалі яе скотчам і пакінулі ў прыбыральні. У далейшым ёй першай удалося вызваліцца ад путаў і выклікаць міліцыю. Самі рабаўнікі ўцяклі на банкаўскім аўтамабілі.

Злачынцы выкралі, паводле папярэдніх звестак, больш як Br1 млрд, каля $40 тыс., 20 тыс. еўра і сярэбраныя зліткі. Дакладная сума выкрадзенага будзе вызначана пасля таго, як банк скончыць рэвізію.

Следства ўстанавіла, што злачынцы ад'ехалі ў лес за 20 км ад Любані, пераселі ў загадзя падрыхтаваную машыну, а банкаўскую спалілі. Выкрадзеныя грошы злачынцы дамовіліся не траціць працяглы час і схавалі ў вёсцы непадалёку ад Любані ва ўмоўленым месцы. Тым не менш, у следства ёсць падставы лічыць, што адзін з удзельнікаў парушыў змову і прысвоіў частку выкрадзенага.

Асоба арганізатара злачынства была вызначана на трэці дзень пасля ўчынення грабяжу, а яшчэ праз суткі следчыя высветлілі асобы двух саўдзельнікаў. Арганізатар грабяжу і адзін з яго змоўшчыкаў былі затрыманы 25 красавіка. Яшчэ адзін магчымы саўдзельнік абрабавання пакуль на волі. Яго месцазнаходжанне вызначаецца.

Практычна ўсе выкрадзеныя сродкі знойдзены і, магчыма, на час следства будуць перададзены на захоўванне менавіта пацярпеламу банку.

Следству ўдалося так хутка дабіцца вынікаў менавіта таму, што абрабаванне яўна было ажыццёўлена асобай, якая ведала ўстройства сістэмы бяспекі банка. Гэта звузіла кола падазроных. Супрацоўнік дэпартамента аховы, які дзяжурыў у тую нядзелю ў банку, знаходзіцца дома, яго жыццю нішто не пагражае, як і жыццю касіра.

За апошнія 10 гадоў гэта найбуйнейшае такое абрабаванне ў Беларусі.

СКЛАДЫ ЗАТАВАРВАЮЦЦА. АЛЕ САЛЬДА ЗАМЕЖНАГА ГАНДЛЮ — СТАНОЎЧАЕ

Сёлета ў першым квартале ў айчыннай прамысловасці назіраецца невялікі спад вытворчасці ў параўнанні з леташнім перыядам. І даволі шмат прадукцыі пасля выпуску адпраўляецца... на склад. Праблема датычыцца арганізацый усіх формаў уласнасці — як дзяржаўнай, так і прыватнай.

Найбольш складаная сітуацыя па затаваранасці — на прадпрыемствах машынабудавання. Істотна павялічылася колькасць нераспрададзеных грузавікоў, трактароў, седлавых цягачоў, аўтобусаў і кар'ерных самазвалаў. Гэта тлумачыцца рознымі фактарамі. Сярод іх — уступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, «прасяданне» па іншых рынках збыту. Цяпер на айчынных «паліцах» ляжыць каля 80 працэнтаў сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Аднак сітуацыя не катастрафічная, — запэўніў намеснік міністра эканомікі Беларусі Аляксандр Ярашэнка.

Якое выйсце з падобнага становішча? Эфект ад дэвальвацый двухгадовай даўнасці ўжо практычна вычарпаны. Таму застаецца толькі адзін шлях — павышаць якасць прадукцыі, адначасова зніжаючы яе энергаёмістасць. І праца тут вядзецца добрая: за першы квартал эканоміка спажыла паліва-энергетычных рэсурсаў на пятую частку менш у параўнанні з такім жа перыядам 2012 года.

З-за прамысловасці адбылося і паніжэнне агульнага паказчыка валавага ўнутранага прадукту Беларусі. «Уклад» у агульны «мінус» склаў -0,4%. Але сітуацыю выраўноўваюць гандаль, падаткі і будаўніцтва. Такім чынам, эканоміка ў першым квартале выраслa на тры с паловай працэнты.

Неадназначна складваецца сітуацыя ў знешнім гандлі. Імпарт тавараў за два месяцы перавысіў іх экспарт на 280 мільёнаў долараў. Але выратаваў гандаль паслугамі, які выйшаў у плюс на 472 мільёны. Такім чынам, сальда знешняга гандлю склалася станоўчым, чаго не было з мінулага жніўня. А гэта, у сваю чаргу, дапамагае разлічвацца па знешніх пазыках. Як зазначыў першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір Амарын, за першы квартал краіна выплаціла замежным крэдыторам 330 мільёнаў долараў, з іх 265 мільёнаў — Міжнароднаму валютнаму фонду. Сёлета Мінфін плануе пазычыць на ўнутраным рынку недзе 300-400 мільёнаў долараў. Чарговы выпуск валютных аблігацый запланаваны на верасень. Не выключаецца і магчымасць прыцягнення замежных пазык.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Хакей

ЧЭМПІЯНАТ ПАСТАВІЛІ НА КОЛЫ

Дырэкцыя чэмпіянату свету па хакеі атрымала першыя аўтамабілі ад прадпрыемства «ФелОкт-сервис», імпарцёра кампаніі «Шкода» ў Беларусі

Чаму падчас хакейнага першынства афіцыйныя асобы будуць карыстацца чэшскімі аўтамабілямі? Колькі іх паступіць у дырэкцыю чэмпіянату? І ці будуць арганізатары супрацоўнічаць з айчынным аўтапрамам? Адказы на гэтыя пытанні шукайце ў нататках карэспандэнта «Звязды».

«Шкода Суперб» — адна з дзвюх мадэляў чэшскага аўтагіганта, якой скарыстаюцца госці і ўдзельнікі хакейнага першынства.

Пакуль хакеісты Андрэя Скабелкі актыўна рыхтуюцца да чарговага планетарнага першынства, якое сёлета пройдзе ў Стакгольме і Хельсінкі, беларускія арганізатары будучага турніру таксама ў працы. На днях, між іншым, атрымалі першыя ключы ад аўтамабіляў, якімі на час чэмпіянату свету ў Мінску скарыстаюцца прадстаўнікі міжнароднай хакейнай федэрацыі, арганізатары, ганаровыя госці і кіраўнікі зборных.

— З 1993 года «Шкода» з'яўляецца спонсарам чэмпіянатаў свету па хакеі, — адзначыў у прамове **Георгій КАЛЕНЧЫЦ, генеральны дырэктар «ФелОкт-сервис».** — Гэтае ўзаемадзеянне аўтакампаніі праяўляецца ў супрацоўніцтве мясцовых імпарцёраў з дырэкцыяй па правядзенні чэмпіянату свету. Наша задача — закупіць аўтамабілі, растаможыць, усталяваць нумары, застрахаваць і перадаць іх у арэнду.

«Шкода», дарэчы, апошнім часам актыўна ўдзельнічае ў спонсарскіх праектах, звязаных са спортам. І гэта не толькі тычыцца хакея, сочынскай Алімпіяды, але і іншых спаборніцтваў. Як адзначыў у асабістай размове Янэк Раўн, рэгіянальны сэрвісны менеджар «Шкоды», чэшскі аўтагігант аказвае дапамогу спаборніцтвам па веласпорце, а таксама футбольнаму клубу «Млада Балеслаў», які базіруецца ў аднайменным горадзе, кроўна звязаным з вытворчасцю славутых аўтамабіляў.

Аляксандр ШЭВЕЛЬ (злева) уручае Георгію КАЛЕНЧЫЦУ падарунак з сімволікай чэмпіянату свету па хакеі-2014.

2.4.2. распечатать документ, формируемый в системе «Интернет-банкинг» по факту акцепта публичной оферты (заключения настоящего Договора), и удостоверить его в подразделении Вкладополучателя, что осуществляется путем проставления печати вышеуказанного подразделения Вкладополучателя, подписи уполномоченного работника Вкладополучателя с указанием должности, ФИО и даты удостоверения документа;

2.4.3. ежемесячно получать Основной доход по вкладу в соответствии с пунктом 3.4 настоящего Договора;

2.4.4. при отсутствии до наступления срока возврата вклада расходных операций (за исключением перечисления сумм Основного дохода в соответствии с пунктом 3.4 настоящего Договора), получить Премиальный доход путем присоединения к остатку вклада в день списания остатка вклада для его зачисления на текущий счет в связи с наступлением срока возврата вклада.

3. ДОХОД ПО ВКЛАДУ

3.1 Основной доход по вкладу на момент заключения настоящего Договора начисляется исходя из процентной ставки (в процентах годовых) в размере, установленном уполномоченным органом Вкладополучателя и действующем по вкладу на момент заключения настоящего Договора.

Размер Основного дохода (в процентах годовых) указывается Вкладополучателем на официальном веб-сайте Вкладополучателя в сети Интернет (www.asb.by).

3.2. Размер процентной ставки Основного дохода может изменяться Вкладополучателем в одностороннем порядке после предварительного уведомления Вкладчика путем размещения объявлений на информационных стендах Вкладополучателя, размещения информации на официальном веб-сайте Вкладополучателя в сети Интернет (www.asb.by) и опубликования в газете «Звязда». Днем предварительного уведомления считается день опубликования в вышеназванной газете. В случае уменьшения Вкладополучателем в одностороннем порядке размера указанной ставки новый размер применяется к вкладу по истечении одного месяца со дня уведомления. В случае увеличения Вкладополучателем размера указанной ставки новый размер применяется к вкладу со дня принятия решения уполномоченного органа Вкладополучателя, если иной день не указан в данном решении.

3.3. Премиальный доход по вкладу в размере 1,8 (Одной целой восьми десятых) процента годовых выплачивается в день списания остатка вклада для зачисления на текущий счет в связи с наступлением срока возврата вклада при условии отсутствия расходных операций по вкладу (за исключением расходных операций, связанных с ежемесячным списанием Основного дохода согласно пункту 3.4 настоящего Договора). Премиальный доход начисляется за период со дня акцепта публичной оферты (заключения настоящего Договора) до дня списания остатка вклада для его зачисления на текущий счет.

При совершении до наступления срока возврата вклада расходной операции (за исключением расходной операции, связанной с ежемесячным списанием Основного дохода согласно пункту 3.4 настоящего Договора), Премиальный доход по вкладу не выплачивается.

3.4. Если иное не предусмотрено настоящим Договором, до дня наступления срока возврата вклада причитающийся по вкладу Основной доход выплачивается по истечении каждого месяца хранения вклада путем присоединения причитающейся суммы Основного дохода к остатку вклада и последующим списанием (не позднее первого рабочего дня, следующего за днем присоединения) с вкладного счета для зачисления на текущий счет.

Если день присоединения Основного дохода к остатку вклада приходится на выходной или праздничный день, то списание причитающейся суммы Основного дохода для последующего зачисления на текущий счет производится в первый рабочий день, следующий за выходным или праздничным днем.

Если день возврата вклада приходится на выходной или праздничный день, то выплата дохода (Основного и Премиального) путем присоединения к остатку вклада (с последующим в этот же день списанием с вкладного счета для зачисления на текущий счет) производится в первый рабочий день, следующий за выходным или праздничным днем. В этом случае доход (Основной и Премиальный) по вкладу за вышеуказанные дни начисляется по ставке, действовавшей по вкладу в последний день, предшествующий дню наступления срока возврата вклада.

Сроки зачисления на текущий счет причитающегося по вкладу дохода (Основного и Премиального) определяются пунктом 1.3 настоящего Договора.

3.5. Выплата Основного дохода путем присоединения к остатку вклада производится также в порядке и сроки, предусмотренные частью второй пункта 4.3 настоящего Договора.

3.6. При начислении дохода количество дней в году принимается фактическое (365 или 366 в високосном году). Доход по вкладу начисляется за каждый календарный день года исходя из ежедневных фактических остатков суммы вклада. При этом начисление дохода на сумму денежных средств по вкладу производится со дня ее перевода и до дня ее списания.

3.7. Со дня перевода (списания), денежные средства в сумме перевода (списания) хранятся на условиях, установленных для соответствующего вкладного счета (текущего счета), на который производится зачисление.

4. УСЛОВИЯ СОВЕРШЕНИЯ РАСХОДНЫХ ОПЕРАЦИЙ

4.1. Совершение в период до дня наступления срока возврата вклада любой расходной операции, в том числе совершение расходной операции наличными денежными средствами, а также при списании в вышеуказанный период суммы вклада (части вклада) без согласия Вкладчика на основании предписания уполномоченного государственного органа или в иных установленных законодательством случаях (за исключением расходных операций, совершаемых согласно пунктам 3.4 и 4.3 настоящего Договора) влечет перерасчет суммы причитающегося к выплате Основного дохода по пониженной процентной ставке, равной процентной ставке, действовавшей по вкладу до востребования в белорусских рублях для физических лиц с учетом изменения ее размера.

При проведении перерасчета Основного дохода Вкладополучатель определяет разницу между фактически выплаченным Вкладчику Основным доходом и начисленным по пониженной процентной ставке.

Если выплаченный Основной доход превышает сумму начисленного Основного дохода по пониженной процентной ставке, Вкладополучатель производит зачет встречных однородных требований и совершает расходную операцию после уменьшения остатка вклада на сумму образовавшейся разницы.

4.2. При совершении расходной операции по вкладу в соответствии с пунктом 4.1 настоящего Договора:

в рабочий день – остаток вклада вместе с причитающейся суммой Основного дохода зачисляется на текущий счет не позднее двух рабочих дней, следующих за днем совершения указанной расходной операции;

в выходной или праздничный день – остаток вклада вместе с причитающейся суммой Основного дохода зачисляется на текущий счет не позднее двух рабочих дней, начиная с первого рабочего дня, следующего за выходным или праздничным днем.

При этом денежные средства в сумме расходной операции со дня ее совершения хранятся исходя из условий договора текущего счета, на который производится зачисление.

При наступлении срока возврата вклада списание остатка вклада с причитающейся суммой дохода производится в порядке и сроки, установленные настоящим Договором.

4.3. При обращении наследника (иного правопреемника) Вкладчика, выплата причитающейся ему суммы вклада (части вклада) возможна непосредственно с вкладного счета.

Со дня совершения указанной выплаты наследнику (иному правопреемнику) Вкладчика остаток вклада хранится на вкладном счете с начислением Основного дохода по пониженной процентной ставке, равной процентной ставке, действовавшей по вкладу до востребования в белорусских рублях для физических лиц, с учетом изменения ее размера. Приходные операции по вкладу не проводятся. Капитализация причитающегося по вкладу дохода проводится в последний день года.

До первой расходной операции, совершаемой на основании свидетельства о праве на наследство (иного аналогичного по назначению документа), расходная операция по вкладу не влечет перерасчета и последующего начисления Основного дохода по пониженной процентной ставке, если она совершается:

лицом, указанным в завещательном распоряжении, оформленном в подразделении Вкладополучателя, при условии ее совершения в полной сумме, причитающейся данному лицу согласно завещательному распоряжению;

лицом, указанным в представленном в банк решении нотариуса, при условии ее совершения в полной сумме, причитающейся данному лицу согласно решению нотариуса.

4.4. Любые расходные операции по вкладному счету, совершаемые наличными денежными средствами (Вкладчиком, представителем Вкладчика, наследником Вкладчика и т.п.), осуществляются только в подразделении Вкладополучателя.

5. ПРОЧИЕ УСЛОВИЯ

5.1. Если иное не предусмотрено настоящим Договором, Вкладчик вправе пополнять (с учетом положений пункта 1.4 настоящего Договора) вклад путем перевода денежных средств до дня наступления:

срока возврата вклада;

события (обстоятельства), указанного в пунктах 4.1 – 4.3 настоящего Договора.

5.2. В отношении имеющегося вклада завещательное распоряжение может быть составлено, а доверенность удостоверена Вкладополучателем в подразделении Вкладополучателя в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и локальных нормативных правовых актов Вкладополучателя.

5.3. За дату истечения месячного срока по Договору принимается дата, которая по названию своего числа месяца является такой же, что и название числа месяца даты заключения договора. Если дата истечения срока приходится на месяц, в котором нет соответствующего числа, то датой истечения срока является последнее число такого месяца.

5.4. При образовании нулевого остатка вкладной счет закрывается Вкладополучателем в установленном им порядке.

5.5. Вкладополучатель несет ответственность, установленную законодательством Республики Беларусь, за привлечение вкладов (депозитов) без лицензии на осуществление банковской деятельности либо в период отзыва или приостановления данной лицензии, в том числе в части осуществления банковских операций по привлечению денежных средств физических лиц.

5.6. Спорные вопросы, возникающие при исполнении настоящего Договора, разрешаются путем проведения переговоров. При недостижении согласия споры по настоящему Договору рассматриваются судом в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.

5.7. Сохранность и возврат вклада гарантируются в порядке, установленном законодательством.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

■ Кватэрнае пытанне

ЗНЯЦЬ МОГУЦЬ. КАЛІ...

Мне, як чаргавіку (жыву з сям'ёй у інтэрнаце), выдзелілі зямельны ўчастак для будаўніцтва індывідуальнага жылога дома і адразу ж папярэдзілі, што знімуць з кватэрнага ўліку па месцы жыхарства. Ці законнае такое рашэнне?

С. К., г. Гродна.

Дзейнае заканадаўства змяшчае канкрэтны пералік падстаў для зняцця грамадзян з уліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Так, у адпаведнасці з п. 1 арт. 44 новага Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ЖК) грамадзяне здымаюцца з уліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў — у прыватнасці, у выпадку паляпшэння жыллёвых умоў, калі ў выніку гэтага адпалі падставы для прызнання іх асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

У нашым выпадку, паколькі дом яшчэ не пабудаваны і жыллёвыя ўмовы не палепшыліся, падстаў для зняцця сям'і з уліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў няма.

Разам з тым, неабходна звярнуць увагу, што згодна з п. 8 арт. 42 ЖК грамадзяне, якія атрымалі пасля 1 студзеня 2011 г. зямельныя ўчасткі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі як асобы, якія знаходзіліся на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, да прыняцця рашэння аб зняцці іх з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па падставах, прадугледжаных п. 1 арт. 44 ЖК, або рашэння аб адабранні зямельных участкаў не накіроўваюцца на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылых памяшканняў у складзе арганізацыі забудоўшчыкаў або на заключэнне дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай.

Віктар САВІЦКІ

■

■ Новыя лісты пра галоўнае

«МОВУ, ЯК І ВЕРУ Ў БОГА, ВЕЛЬМІ ВАЖНА АТРЫМАЦЬ З МАЛЕНСТВА»

...Задачку задалі — прычым з самага ранку: на прыпынку ля аўтавакзала «Усходні» бабуля спыніла, папыталася, дзе тут можна гумовікі дзеду купіць?

Азірнулася: побач гандлёвы цэнтр «Купец», але ж патрэбныя боты там наўрад ці будуць. Рукою падаць да «Гіпа» — там штось сезоннае заўсёды бывае, але ж не факт, што і гумовікі. Трохі паводдаль, у радыусе аднаго-трох прыпынкаў — крамы спорттавараў і «Марка», дзе — гарантыя — нейкія боты будуць, але ж можа не быць патрэбнага памеру, фасону, кошту...

— Найлепш, мусіць, — ва ўнівермаг «Беларусь» пад'ехаць, — параіла бабулі. — Адзін прыпынак на адным тралейбусе, там трохі прайсці, потым два — на другім...

— Не, — сумна ўсміхнулася жанчына, — гэта не з маім спрытам. Ды і не ведаючы, што да чаго, яшчэ заблуджуся. А ў мяне аўтобус праз гадзіну... Хіба, можа, да «Спорттавараў» дайду?

...Не ведаю, ці адважылася на гэта госця нашай сталіцы. Не ведаю, ці пашчасціла ёй купіць свайму чалавеку патрэбную, відаць, абнову. Цалкам магчыма, што не... І не столькі з-за таго, што бракавала жанчыне спрыту і часу, ведання горада. Бракавала, думаю, зразумелай інфармацыі, бракавала... мовы, бо на амаль двухмільённы Мінск, паводле даведніка, усяго дзве крамы з шыльдай — «Абутак», дзевяць «Обувь», незлічона (што яшчэ зразумела) айчынных фірмовых — «Луч», «Белвест», «Белкельме», «Марко». Як і замежных — «Axis», «Баден», «Vito», «Стэп»... На ўсё пра ўсё, як той казаў, адны «Чаравічкі».

«Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у нашай краіне на аднолькавых правах існуюць дзве дзяржаўныя мовы — беларуская і руская. Аднак апошнім часам складваецца ўражанне, што ў нас застаецца толькі адна афіцыйная і дзяржаўная — руская, а вось беларуская ў незалежнай Беларусі паступова ператвараецца ў замежную, — піша **спадар Яўген ШУХНО**. — Верагодна, усе мы сутыкаліся з модай на іншамоўныя назовы — крам, кавярняў, розных вырабаў (ад парфумы да цукерак). Па-англійску ці па-французску пішацца сама назва, усё астатняе — як правіла, па-руску. Па прыкладах далёка хадзіць не трэба, дастаткова выйсці на вуліцы Мінска ці якога іншага горада. Там калі дзе-нідзе і сустракаецца беларуская назва, то ўжо дадатковая інфармацыя (час працы, прыналежнасць да арганізацыі, склад...) даецца па-руску. Хоць-нехаць атрымліваецца, што назва напісана на... замежнай мове, а тлумачэнне на зразумелай? Вось толькі ў ролі гэтай замежнай выступае мова карэннага насельніцтва, першая дзяржаўная!

Такім чынам, — працягвае аўтар ліста, — у свядомасці грамадзян складваецца стаўленне да беларускай, ужытай толькі ў назве, як да іншаземнай — такой жа, як англійская ці французская. Гэта значыць, праз напісанне па-беларуску толькі назвы адбываецца атаясамліванне моў — беларускай і замежнай: пакрысе яны становяцца ў адзін шэраг».

Спрыяе гэтаму вельмі многае. У прыватнасці, спадар Шухно ў пацвярджэнне сваіх высноў даслаў ксеракопію абгорткі хлеба «Адвячорак», дзе пазначана, што гэты хлеб «аппетитный, нарезанный», што ў «состав» яго «входят мука ржаная хлебопекарная...». Карацей — уся астатняя інфармацыя падаецца па-руску. Адкуль і выснова: «Ператварэнне беларускай мовы ў замежную «шыльдавую» апошнім часам набывае масавы характар, што дае падставы гаварыць пра пэўную тэндэнцыю».

Працяг гэтай тэмы ў лісце з Чавусаў: «Прыйшлі з жонкай да дачкі і ўнучак, — піша **Валерый ГАЎРЫШ**. — Меншая, бачу, слухае мяне, але ж амаль не разумее, бо я размаўляю па-беларуску. А яна і дома, і ў садку пастаянна чуе другую дзяржаўную... Складваецца ўражанне, што яна ўжо і першая».

Як высвятляецца, падставы так думаць дадаў звычайны шакаладны батончык віцебскай «Віцьбы», бо старэйшая з унучак шаноўнага чытача, пакруціўшы ў руках ласунак, папыталася: «Дзед, а чаму на абгортцы ёсць інфармацыя на ўкраінскай, рускай, нават казахскай мове, а на беларускай няма?».

«Што адказаць дзіцяці? — пытае чытач. — Сапраўды, чаму няма? Няўжо той «Віцьбе», «Камунарцы» ці іншым вытворцам цяжка стварыць абгортку на роднай мове? Прадукцыя ідзе за межы? Дык гэта ж добра! Няхай паўсюль, дзе купляюць беларускія тавары, ведаюць, што ёсць такая краіна, што яна мае сваю спаконвечную мову».

Да гэткай жа высновы прыйшла яшчэ адна чытачка «Звязды», якой дзесі на 8 Сакавіка падарылі вельмі прыгожы, цёплы жакет вытворчасці «Пінскага трыкатажу». «Ягo, — піша мінчанка Алена Кушаль, — прынеслі ў празрыстым фірмовым пакеце... Да таго ж не слоган на ім, а проста цуд: «В этой жизни все связано»! Што так, тое так, пагадзіцеся. Але ж чаму па-руску? Няўжо, калі б напісалі, што «Усё ў гэтым жыцці звязана», ніхто нічога не зразумеў бы — ні ў нашай краіне, ні за межамі?»

І сапраўды: ну няхай бы ацаніў пакупнік не толькі выраб (дай Бог якасны!). Няхай бы, карыстаючыся выпадкам, паглядзеў, што ў нашай мове ёсць літарка ***ё***, пра якую то заціхаюць, то зноўку ўзгараюцца спрэчкі ў суседняй Расіі, ёсць сваё адметнае і, над якім так добра глядзіцца ***і*** кропачка і, напрыклад, сцяг краіны, ёсць, нарэшце, ***ў*** (у нескладовае), літара, якой няма больш ні ў якай мове свету (пра што пінчукам і казаць няёмка — там гэтай літары помнік стаіць!)... Да таго ж у слогане — побач — ёсць дзве (мяккія ад і) літаркі ***ц***, якія перадаюць пяшчоту, мяккасць... У тым ліку і... трыкатажным вырабам.

Аднак гэта нам чамусьці не трэба. Мы можам захапляцца гучаннем роднае мовы са сцэн тэатраў, з вуснаў дыктараў, спевакоў і журналістаў, услухоўвацца ў беларускамоўную рэкламу, але ж калі трэба штось напісаць (нават адрас «Звязды» на канверце з лістом у... абарону першай дзяржаўнай!), адразу пераходзім на рускую.

Адкуль проста безліч балючых, «чаму»? Вось тут і цяпер — толькі з аднаго, па-беларуску падпісанага канверта: «Чаму ў нашым мястэчку, — цікавіцца спадар Гаўрыш, — назвы вуліц напісаны акурат таксама, як і ў райцэнтры Хіславічы Смаленскай вобласці, з якім Чавусы маюць шмат стасункаў?.. Чаму ў краіне, дзе аб'яўляліся Год роднай зямлі, Год кнігі, Год беражлівасці, не аб'явіць Год роднай мовы?» Бо пакуль яна жыве — жыве і нацыя.

«Мая бабуля нарадзілася ў 1893 годзе, у школу хадзіла «паўтары зімы», але з ахвотай чытала кнігі, якія я прыносіў з бібліятэкі, і размаўляла па-беларуску, — чытаем у лісце спадара Гаўрыша. — Адкуль яна ведала гэтую мову? Ад сваёй маці. Я потым — ад сваёй. Да таго ж усе прадметы ў нашай вясковай школе выкладаліся па-беларуску... А вось у політэхнічным, куды потым паступіў, навучанне ішло ўжо на рускай мове, што здавалася вельмі нязвыклым... Затое якое ж задавальненне было, калі нас, студэнтаў, адпраўлялі на сельгасработы, «на бульбу», калі мы ехалі ў вёску і чулі там чысцюткую, амаль «коласаўскую» беларускую мову. «Быў час, быў век, была эпоха»... Сёння моўная сітуацыя, нават у вёсцы, змянілася карэнным чынам. Што ўжо казаць пра горад...

«Дзякуй, што ёсць беларускамоўная «Звязда», «...Чакаю газету, як некалі малым чакаў з кірмашу бацькоў: «А што ж цікавага і смачнага яны прывязуць?» — Немагчыма пераацаніць тую ролю, якую выконвае «Звязда» ў справе падтрымкі мовы тытульнай нацыі»...

Гэта — радкі з іншых лістоў, якія не могуць не цешыць. Хаця ў шматлікіх (назавём іх так) «моўных спрэчках» усё больш ахвотных назваць беларускую мову ўжо не матчынай і нават не бабулінай, бо, маўляў, яны (і маці і бабуля), нарадзіўшыся і жывучы ў Беларусі, размаўлялі ўжо па-руску...

Але — у кожнага з тутэйшых ёсць яшчэ адна маці, маці-Радзіма. І яе мова — менавіта беларуская. «Як заўважаю, размаўляючы са сваімі нашчадкамі, школьнікі да мовы ставяцца горш, — піша **Валянціна Пабягайла з Ляхавіч.** — Унучка мая добра ведае англійскую, бо перакананая, што яна ёй спатрэбіцца, а вось беларуская, кажа, — наўрад... Яе, мову, — падсумоўвае спадарыня Валянціна, — як і веру ў Бога, вельмі важна атрымаць з маленства». І тады (хай дасць Бог!)...

Раніцай сонца да нас зазірне,
«Зайку» падкіне малечы
ў калыску.
«Доброе утро!» —
прачнуцца ў Маскве.
«Раніцы добрай!» —
вітаемся ў Мінску.

Шчырага сябра ніхто не міне,
Стрэнецца недзе родны
ці блізкі.
«Здравствуйте, здравствуйте!»
— чутна ў Маскве.
«О, прывітанне! Дзень добры!»
— у Мінску.

Хутка ў турботах
дзянёк праміне.
Сонейка зойдзе,
заціхне вятрыска.
Скажуць: «Спокойной вам ночи!»
— ў Маскве.
«Любы, дабранач!» —
пачуецца з Мінска.

О, каб жа праўдаю гэта было,
І, як Масква размаўляе
па-руску,
У Мінску каб гутарку
стала чутно
Толькі на мове сваёй,
беларускай!..

Час пераменлівы.
Усё можа быць
(Я выдаваць тут прагноз
не бяруся)...
Мо і навучымся мы гаварыць
Па-беларуску ва ўсёй Беларусі.

Напісала гэты верш (за што асобны дзякуй!) **спадарыня Раіса Васільева з Гомеля**.

Што да яго дадаць? Хіба кароткае... У двор дома нехта папараць прывёз, пасадзіў ля самай праезнай часткі. Колькі разоў яе дратавалі, колькі наязджалі коламі машын — падліку не паддаецца! А яна ўсё роўна жывая...

Пакуль.

Чытала лісты Валянціна ДОЎНАР

■

■ Нераўнадушныя нататкі

ДЛЯ ЎСІХ? АЛЕ Ж І ДЛЯ СЯБЕ

Марафет на працоўным месцы ў пятніцу я навяла хутка, бо стараюся трымаць яго ў належным стане. І вось надышла субота. Зраблю гэты выхадны працоўным, вырашыла я. Падышла да нашага работніка па комплекснай уборцы тэрыторыі, так цяпер называюць дворнікаў. Рыма ўзрадавалася дадатковай рабочай сіле і адразу вызначыла фронт работ — тэрыторыю за нашым домам. «Сухую траву трэба зграбаць, каб хутчэй пайшла свежая. Акуркі змятаем у кучу. Пластыкавыя бутэлькі і шкляныя, што не прымаюць, складвай у асобны пакет і нясі ў спецыяльны кантэйнер», — указанні Рымы здаюцца простымі, і я прыступаю да сваіх абавязкаў. Найперш сабрала ПЭТ-бутэлькі і некандыцыйную шклатару. Пасля ўзялася за траву. Суседзі, што шыбавалі па сваіх справах, спыняліся і хвалілі мяне за грамадзянскую свядомасць, але самі чамусьці не спяшаліся далучацца. Паўдзельнічаць у тым, што не дае імгненнай выгады, сёння, на жаль, згодны не кожны.

Рыма, з якой мы шчыравалі на вялікай тэрыторыі, нібыта, прачытаўшы мае думкі, заўважыла: «Усе хочуць жыць ў прыгажосці, чысціні, але дзеля гэтага і пальцам не варухнуць. Ды што там, хоць бы не кідалі на зямлю ўсё, што заўгодна». І толькі жанчына прамовіла гэта, як на куртку ёй спікіраваў непатушаны акурак. Скінула я «бычок» са спіны напарніцы і прапанавала звярнуцца ў міліцыю: «Аштрафуюць хулігана на вялікую суму, зараз з курэннем у пад'ездах і на агульных балконах строга». Але Рыма толькі загадкава зазначыла: «Не трэба, я сама яго вылічу».

Вы любіце хатніх гадаванцаў: катоў ды сабачак? Я таксама. А вось іх несвядомых гаспадароў гатова парваць, як той Тузік грэлку. Сышоў снег і агаліў усё, што пакінулі чатырохногія сябры двухногіх істот. Рыма з такімі «падарункамі» спраўляецца сама — для яе гэта звыклая справа. А я проста назіраю, як паводзяць сябе гаспадары, што вывелі на прагулку сваіх любімчыкаў. Ніводзін не ўзяў з сабой шуфлік і пакецік, хаця, у адпаведнасці з правіламі ўтрымання жывёл, гэта трэба абавязкова рабіць. Дарэчы, правіламі прадугледжаны штраф за невыкананне патрабаванняў, але гэта не палохае гаспадароў: норма закона прымяняецца вельмі рэдка. Яно і зразумела: каля кожнага Шарыка міліцыянера не паставіш. Але чаму мы церпім такія нахабныя паводзіны сабачнікаў, ніяк на іх не рэагуем? Хутка дачакаемся, што ўвогуле нельга будзе прайсці па дварах — колькасць чатырохногіх гадаванцаў павялічваецца.

Але між тым, сёння можна сказаць, што ўсё больш людзей пачынае дбаць пра навакольнае асяроддзе. І мая калега пазнаёміла з такім чалавекам, якому дворнікі далі мянушку «ПЭТ-дзівак». Гэты чалавек, можна сказаць, пайшоў у наступленне на пластыкавыя бутэлькі. «Калі я даведаўся, што пластык не разбураецца ў зямлі некалькі дзесяцігоддзяў, то вырашыў: трэба пачынаць дзейнічаць, — зазначае Іван Фёдаравіч. — Па-першае, сам пачаў збіраць пластыкавую тару і адносіць яе ў жоўты кантэйнер. Па-другое, размясціў каля кожнага пад'езда інфармацыю для людзей: чым шкодная неўпарадкаваная тара, як на карысць нам яе можна перапрацаваць. І яшчэ: не маўчу, калі бачу, што хтосьці кідае бутэлькі з-пад соку ці піва абы-дзе. І, ведаеце, гэта дзейнічае, у двары стала чысцей». Эх, пабольш бы такіх неабыякавых, як пенсіянер Паноў! Глядзіш, і аўралаў па навядзенні чысціні не спатрэбілася б.

А тым часам праблемай засмечанасці мінскіх двароў і вуліц занепакоіліся гарадскія ўлады. Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька даручыў разгледзець магчымасць увядзення штрафу за раскідванне смецця ў грамадскіх месцах. Асаблівая ўвага надаецца якраз прыдамавым тэрыторыям. На думку чыноўнікаў, увядзенне штрафу дазволіць выхаваць у людзей адказнасць і павагу да працы камунальшчыкаў. Гэта павінна распаўсюдзіцца і ў іншых рэгіёнах. Да слова, мера гэта не новая. У Чэхіі штраф за раскідванне смецця складае 50 еўра, у Іспаніі — 90, а ў Швецыі, якая так славіцца сваёй чысцінёй, — 170 еўра.

Дык што, будзем чакаць пакарання рублём? Ці ўсвядомім, што трэба паводзіць сябе па-людску не толькі ў сваіх дамах і кватэрах?..

Вольга ШАЦІЛАВА

■

Открытое акционерное общество «Хоум Кредит Банк»

Республика Беларусь,
220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91, www.homecredit.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2013 года.

ОАО «ХКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2013	01.04.2012
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	25 313,4	10 547,5
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	382 370,3	227 712,8
5	Средства в банках	1104	194 326,3	51 842,2
6	Ценные бумаги	1105	39 533,6	-
7	Кредиты клиентам	1106	726 202,3	458 095,4
8	Производные финансовые активы	1107	-	64 873,4
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	21 271,0	13 741,9
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	43 927,4	27 252,7
13	**ИТОГО активы**	11	**1 432 944,3**	**854 065,9**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	67 246,4	65 635,4
16	Средства банков	1202	268 702,5	90 294,8
17	Средства клиентов	1203	831 060,9	465 870,6
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	-	-
19	Производные финансовые обязательства	1205	669,9	-
20	Прочие обязательства	1206	12 008,3	8 161,7
21	**ВСЕГО обязательства**	120	**1 179 688,0**	**629 962,5**
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	144 787,0	144 787,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	7 239,3	7 239,3
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	5 039,4	3 777,9
27	Накопленная прибыль	1215	96 190,6	68 299,2
28	**ВСЕГО капитал**	121	**253 256,3**	**224 103,4**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	12	**1 432 944,3**	**854 065,9**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2013 года.

ОАО «ХКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2013	01.04.2012
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	37 863,8	21 634,5
2	Процентные расходы	2012	62 015,3	49 762,6
3	Чистые процентные доходы	201	(24 151,5)	(28 128,1)
4	Комиссионные доходы	2021	111 776,2	58 453,6
5	Комиссионные расходы	2022	3 909,2	1 952,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	107 867,0	56 501,0
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(73,5)	(102,2)
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(5 592,5)	(11 056,1)
11	Чистые отчисления в резервы	207	7 984,3	(15 969,2)
12	Прочие доходы	208	6 260,5	5 930,7
13	Операционные расходы	209	33 849,7	23 372,9
14	Прочие расходы	210	9 024,4	7 136,7
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	33 451,6	8 604,9
16	Налог на прибыль	212	3 595,8	3 989,9
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	2	**29 855,8**	**4 615,0**

Заместитель Председателя Правления **Сергеев С.В.**
Главный бухгалтер **Лаптенок Г.П.**
Дата подписания «17» апреля 2013 года.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 18 от 29.11.2007 г. УНП 807000056.

■ Здаровае харчаванне

НЕ ПЕРАЯДАЙЦЕ — І НЕ «ЗАШЛАКУЕЦЕСЯ»

Здароваму харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай спецыяліста па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ.

Колькі бананаў у дзень можна ўжываць?

Звычайна здароваму чалавеку рэкамендуецца ўжыванне 1-2 бананаў у дзень — у якасці прыемнага дапаўнення да асноўных прыёмаў ежы. Бананы нярэдка спалучаюць з малочнымі прадуктамі (напрыклад, ёгуртам) або зялёнай гарбатай.

Лепей ужываць спелыя плады — з роўным жоўтым колерам і гладкай лупінай. Зеленаватыя плады варта загарнуць у паперу і пакласці даспяваць на пару дзён пры пакаёвай тэмпературы.

Якое яйка будзе больш карысным: варанае, смажанае або сырое?

Яйкі — практычна ідэальны прадукт харчавання. Любое яйка — гэта адна яйцаклетка, задача якой быць крыніцай жыцця і харчавання для зародыша, таму ў любым яйку практычна ідэальны склад бялку і іншых харчовых інгрыдыентаў (вядома, для зародыша таго віду, які запланаваны, а менавіта курынае — для кураняці, кракадзіліна — для кракадзільчыка і г.д.).

Яйкі лепш ужываць адваранымі ўсмятку, калі яечны бялок часткова «звярнуўся» ад цеплавога ўздзеяння, а жаўток застаўся паўгатовым і захаваў амаль усе карысныя вартасці. Далей па ступені засваення ідуць яйкі, звараныя «ў мяшэчак», затым — укрутую. Дэнатураваныя бялок і жаўток патрабуюць інтэнсіўнай работы страваваль най сісітэмы для іх расшчаплення і засваення. Горш за ўсё засвойваюцца яйкі смажаныя, таму рэкамендуецца не смажыць, а запякаць пад накрыўкай на патэльні з антыпрыгарным пакрыццём, на малым агні. Або прыгатаваць паравы амлет. Сырыя яйкі наогул ужываць не рэкамендуецца. Сыры яечны бялок парушае ўсмоктванне некаторых важных рэчываў, дрэнна расшчапляецца і засвойваецца арганізмам чалавека, паколькі змяшчае рэчывы, здольныя блакіраваць дзеянне страваваль ных ферментаў.

Салодкае лепш ужываць да яды ці пасля?

Гэта залежыць ад таго, якога эфекту вы хочаце дасягнуць. Калі салодкага хочацца, але страшна дадаць «лішнія» калорыі, можна з'есці салодкае перад ядой — гэта прыглушыць апетыт. Але гэта не натуральны варыянт.

Можна сустрэць у інтэрнэце інфармацыю, што салодкія стравы трэба есці праз 2 гадзіны пасля абеду. Ніякіх навуковых даных на гэты конт няма. А калі меркаваць лагічна, то салодкае пасля сытнага абеду будзе проста лішнім. Таму ў якасці дэсерту заўсёды лепш выкарыстоўваць не салодкае, а свежыя, запечаныя, зацукраваныя або сушаныя фрукты ў любым выглядзе. Але заўсёды варта падумаць, ці так ужо неабходны дэсерт пасля багатай трапезы. Акрамя таго, калі вугляводаў у ежы «перабор», то дадатковая нагрузка ў выглядзе салодкага дэсерту выкліча ўзмацненне брадзільных працэсаў, успушванне жывата, а ў некаторых выпадках — і дыярэю.

Заменнік цукру: каму і колькі?

Ужыванне цукру ў харчаванні — не неабходнасць, а толькі справа звычкі. Цукар у арганізме ператвараецца ў глюкозу, якая з'яўляецца асноўным пастаўшчыком энергіі. Але ў глюкозу ў выніку ператвараюцца любыя вугляводы — напрыклад, крухмал, які ёсць у бульбе, іншай гародніне, злаках, фруктах, макароне і г.д. Толькі з цукру глюкоза атрымліваецца хутка, а для таго, каб расшчапіць да глюкозы крухмал, арганізму трэба пастарацца.

Цукразаменнікі — не вырашэнне праблемы. Лепш выкарыстоўваць натуральныя вугляводы. Проста трэба кантраляваць іх колькасць і адвыкаць ад звычкі сыпаць цукар без меры. Натуральныя цукразаменнікі (кшталту сарбіту, ксіліту або фруктозы) дапушчальна выкарыстоўваць хворым на цукровы дыябет, і тое па прызначэнні ўрача і пад строгім кантролем колькасці.

За адзін прыём ежы кішэчнік здольны засвоіць прыкладна 20-30 г бялку — каля 150 г мяса ці рыбы. А калі чалавек з'еў 300-грамовы «кусманчык»? Значыць, 150 г пойдуць «у справу», а астатнія 150 дастануцца кішэчным мікраарганізмам.

Ці можна дадаваць у гарбату малако або вяршкі?

Шмат даводзіцца чуць аб тым, што малако ці вяршкі ў спалучэнні з кавай ці гарбатай нейтралізуюць карыснае дзеянне гэтых напояў, а тое і наносяць непапраўную шкоду. Аднак у навуковай літаратуры канкрэтных даных па гэтай тэме няма.

І каву, і гарбату людзі ўжываюць з даўніх часоў і выкарыстоўваюць гэтыя напоі для ўзняцця працаздольнасці, бадзёрасці, змяншэння пачуцця стомленасці. Гэта ўсё — дзеянне на арганізм кафеіну і падобных на яго рэчываў (тэабраміну і тэафіліну), якія знаходзяцца ў кававым зерні і лісцях гарбаты. Дарэчы сказаць, самі расліны (кававае дрэва і кусты гарбаты) сінтэзуюць гэтыя рэчывы зусім не для чалавека, а як абарону раслін ад насякомых. Кафеін валодае спецыфічным дзеяннем на нервовую сістэму, таму насякомых ён забівае, а чалавека, паколькі ён усё ж такі больш вялікі за жучка, толькі прыводзіць ва ўзбуджаны стан. Праўда, калі «накафеініцца» звыш меры, то і чалавеку мала не падасца. Дзеянне кафеіну на арганізм вывучана даўно і апісана ў навуковай літаратуры. У кубку кавы ці гарбаты колькасць кафеіну можа адрознівацца ў разы — у залежнасці ад гатунку і спосабу гатавання.

І каву, і гарбату стагоддзямі ўжываюць з малаком ці вяршкамі — хоць бы проста з-за смаку. Напрыклад, англічане, ад якіх і пайшла мода на гарбату з малаком, наогул не задумваліся, карыснае такое спалучэнне ці не. Яны проста бераглі свае фарфоравыя кубкі, каб тыя не трэснулі ад кіпеню, таму спачатку налівалі ў кубак малако, а потым далівалі заварку.

Дадаванне малака, відавочна, змякчае смак, дый элементарна змяншае канцэнтрацыю кафеіну ў порцыі. Індусы наогул заварваюць чайнае лісце гарачым буйвалінym малаком, дадаюць шмат цукру і вельмі любяць такі напой. Я і сама так гатую гарбату, толькі выкарыстоўваю звычайнае малако.

Калі ж гаварыць пра хімічнае ўздзеянне кафеіну і кампанентаў малака, то тут малако валодае буфернымі вартасцямі, ашчалачвае настой кавы ці гарбаты. Вядома, што ў шчолачным асяроддзі кафеін растварэцца горш. Такая ж з'ява назіраецца і пры зніжэнні тэмпературы, што таксама адбываецца пры дадаванні халоднага малака. Таму можна меркаваць, што такім чынам мы нейтралізуем пэўную частку кафеіну. З пункта гледжання ўрача, я б сказала, што гэта вельмі нядрэнна. Добры настрой і высокую працаздольнасць чалавеку павінны даваць цікавая справа і любоў, а не стымулятары. З другога боку, калі чалавек за дзень выпіе 1-2 кубкі любой кавы ці гарбаты, то з чым бы ён ні ўжываў гэтыя напоі, хоць з салёнымі агуркамі, гэта ніяк не падарве яго здароўе. А вось калі чалавек кожныя гадзіну-дзве бегае з чайнікам у руках, то сумарна ён можа нанесці арганізму шкоду — і кафеінам, і малочнымі дабаўкамі. Homo sapiens павінен кантраляваць працэс.

Ці праўда, што існуюць спецыяльныя дэтокс-кактэйлі, якія выводзяць шлакі і нармалізуюць дзейнасць страўнікава-кішачнага тракту?

Для таго, каб жыць, чалавеку неабходна аднекуль атрымліваць энергію. Ён вымушаны здабываць сабе ежу. Ежа ў арганізме праходзіць шэраг пераўтварэнняў і дае чалавеку энергію, будматэрыял для росту (пакуль чалавек расце) і для замены «адпрацаваных дэталяў» (клетак). Пры гэтым, вядома, утвараюцца біялагічныя адходы — тое, што называюць шлакамі з лёгкай рукі ўсякіх «лекараў», якія за плату гарантуюць пазбаўленне ад шлакаў і «ачышчэнне арганізма». На самой справе, наш арганізм уяўляе сабой унікальны біялагічны «механізм», здольны да самарэгуляцыі, самааднаўлення і падтрымкі балансу з навакольным асяроддзем. Таму ўсе «адходы» ён умее нейтралізаваць і вывесці самастойна, без дапамогі шарлатанаў.

Іншая справа, чалавек па ўласнай волі паста-янна перагружае арганізм непатрэбнымі, а часам нават шкоднымі для яго рэчывамі — ужывае ўсё без меры, злоўжывае алкаголем, нікацінам, лекамі, фарбавальнікамі і ўсім іншым, што ёсць у нездаровай ежы, ігнаруе сігналы арганізма аб неабходнасці даць яму больш вады для нармальнай працы. У такіх выпадках як бы ні працаваў арганізм, яму не ўдаецца справіцца з «завалам» адходаў. Просты прыклад: за адзін прыём ежы кішэчнік здольны засвоіць прыкладна 20-30 г бялку — каля 150 г мяса ці рыбы. А калі чалавек з'еў 300-грамовы «кусманчык»? Значыць, 150 г пойдуць «у справу», а астатнія 150 дастануцца кішэчным мікраарганізмам. Калі ж мяса пакінуць у цеплыні, то праз нейкі час яно распсуецца, пачнецца мікробная ўтылізацыя бялковага прадукту. Тое ж адбываецца і ў нашым арганізме пры лішнім харчаванні — лішняя ежа падвяргаецца мікробнаму браджэнню і гніенню. І такая «звалка» знаходзіцца ў нашым жываце. Дзякуючы гэтаму чалавек перагружае таксічнымі рэчывамі сваю печань, якая працуе без перапынку, пераводзячы таксіны ў бясшкодныя злучэнні, а таксама ныркі, якім неабходна ўсё гэта «выкінуць». Вось чаму і кажуць пра «зашлакаванасць» арганізма і прапануюць неверагодныя схемы «дэтаксікацыі». А схема тут можа быць адна: каб хутчэй ачысціць «смеццевыя завалы», калі ёсць падазрэнне, што яны назапасіліся, неабходна забяспечыць 1-2 разгрузачныя дні, але не чыстае галаданне, а фруктова-гароднінныя або злакавыя, каб ужыць больш клятчаткі, якая ўзмацняе перыстальтыку і стымулюе часты стул. Для паляпшэння жоўцеаддзялення, каб дапамагчы і печані, і страваванню, можна прызвычаіцца ўжываць 1 ст. л. ільнянога або аліўкавага, а тое і звычайнага сланечнікавага алею. І не забываць піць чыстую ваду. Патрабуецца прыкладна 30 мл на 1 кг вагі. А ў далейшым варта імкнуцца не пераядаць. Гэта нескладана, і нашмат больш эфектыўна за любы «дэтокс-кактэйль» або дыету.

P.S. *Больш інфармацыі па тэме здаровага харчавання можна атрымаць на сайце www.kapitonova.info.*

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Наш культурны асяродак
Жыравандоля
Выпуск № 16 (186)

■ Кінакрокі

ІНШЫМІ ВАЧЫМА

У Японіі хочуць паглядзець сучаснае беларускае кіно

Сталічны кінапракат не перастае радаваць. І хаця засілле амерыканскага кіно ў Беларусі такое ж адчувальна-непераадольнае, як і ва ўсім свеце, час ад часу ў нас праходзяць паказы некамерцыйнага аўтарскага кіно. З 24 па 28 красавіка ў кінатэатры «Цэнтральны» ўжо традыцыйнымі сталі рэтраспектывы. Гэтым разам сталічныя кінагурманы маюць магчымасць пазнаёміцца з сучасным кіно Японіі — краіны, што зусім нядаўна пацярпела ад аварыі на АЭС Фукусіма-1, наступствы якой вельмі жудасныя...

Кадр з фільма Кодзі Фукада «Гасціннасць».

А калі прыгадаць, што пачынальнік беларускага кінематографа Віктар Тураў натхняўся творчасцю знакамітага японскага кінарэжысёра Акіры Курасавы, то, думаецца, японскае кіно нам нават нечым блізкае.

— У Мінску шмат думаючых, цікаўных, дапытлівых гледачоў, — перакананы **Васіль КОКТЫШ, генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама**. — Таму ім патрэбная магчымасць паглядзець аўтарскае кіно на вялікім экране. На жаль, па камерцыйных прычынах, у нас няма магчымасці зрабіць так, каб яно пераважала над амерыканскімі блокбастарамі. Але такім рэтраспектывам мы заўжды рады. Вось, праект Cinemascope, што ў кінатэатры «Ракета», мае наведвальнасць больш за 60%.

Сапраўды, гэта даволі вялікі працэнт наведвальнасці ў прынцыпе, але калі ўлічваць, што зала для праграмы Cinemascope ўсяго на 30 месцаў, то гэта не такі ўжо і добры вынік. Аматары кіно непазбежна сыходзяць у інтэрнэт і на торэнты — спампоўваюць і глядзяць фільмы ў сябе на камп'ютарах. Але застаюцца і такія, хто нязменна хоча бачыць добрае кіно на вялікім экране.

У Японіі штогод здымаюць каля 300 мастацкіх фільмаў. З іх каля 100 — славутае японскае эратычнае кіно, якое з'явілася ў канцы 1950-х гг. для таго, каб вярнуць гледачоў ад тэлевізара да экранаў кінатэатраў. Але ў цэлым у кінапракаце Японіі сітуацыя такая ж, як і ва ўсім свеце.

— У вялікіх гарадах можна паглядзець рознае кіно, але амерыканскія фільмы дамінуюць, — расказвае малады **японскі кінарэжысёр, Кодзі ФУКАДА**, які прывёз у Мінск свой фільм «Гасціннасць». — Але за апошнія 10 гадоў людзі сталі актыўней хадзіць на японскія фільмы, што адметна. Раней хадзілі больш на еўрапейскія. І мне вельмі шкада, што ў нас не паказваюць сучаснае беларускае кіно. Па тэлебачанні часам паказваюць старыя савецкія фільмы, але новага беларускага нічога няма.

Праўда, напрыклад, разнастайнасць кінапракату Японіі ў тым, што там ёсць адмысловыя кінатэатры, дзе паказваюць дакументальнае кіно. У Беларусі, нягледзячы на тое, што наша дакументальнае кіно прызнана ў свеце, паглядзець яго на вялікім экране амаль немагчыма. Хіба што толькі падчас адмысловых фестываляў.

— На дзяржаву ў нас у сэнсе кінавытворчасці не асабліва разлічваюць, — гаворыць Кодзі Фукада. — Часцей за ўсё кіно, якое можна аднесці да катэгорыі незалежнага, здымаецца на спонсарскія грошы або сумесна з тэлебачаннем. Таму за мяжой многія японскія фільмы паказваць немагчыма: яны робяцца свайго роду серыяламі, якія без папярэдніх серый нельга зразумець. І таму многія японскія рэжысёры хочуць рабіць сумесныя праекты. У нас 80% рэжысёраў робяць свае фільмы пры нястачы грошай.

Сумесная кінавытворчасць — гэта лейтматыў усіх кінаперамоў. Сапраўды, разам грошы шукаць лягчэй. Таму ў кулуарах нават чуліся размовы пра тое, як цудоўна было б зрабіць з Японіяй сумесны кінапраект! Напрыклад, пра Іосіфа Гашкевіча, першага дыпламатычнага прадстаўніка Расійскай імперыі ў Японіі, які мае беларускае паходжанне. А ў наступным годзе будзе адзначацца яго 200-годдзе. Напэўна, цудоўна. Але чамусьці ўсе беларускія захады і жаданні пра сумесныя праекты не так ужо і часта ператвараюцца ў рэальныя фільмы.

А пакуль у кінааматараў застаецца яшчэ два дні для таго, каб паглядзець фільм «Цуд» Хіракадзу Корэ-эда і дзве гістарычныя карціны: сцёб з японскай гісторыі «Ножны самурая» Хітосі Мацумота і «Харакіры» Такасі Міке, аднаго з самых вядомых сучасных японскіх рэжысёраў.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

КУЛЬТУРНАЯ БЕРАЖЛІВАСЦЬ

Дзеля чаго рыхтуецца шматтомнае выданне «Гісторыя культуры Беларусі»?

Сутнасць слова «беражлівасць» сёлета тлумачаць усе. У кожнага знаходзіцца свая інтэрпрэтацыя. Але людзям, якія працуюць у культурнай сферы ці маюць дачыненне да яе, даўно зразумела: толькі зберагаючы тое, што зроблена папярэднікамі ці ўсім ходам гісторыі, можна рухацца наперад і працягваць узбагачаць. І не год, і не дзесяцігоддзе ўжо беражлівасць стала, як ні дзіўна, залогам развіцця айчыннай культуры: праз беражлівае стаўленне да традыцый беларускага народа, праз працу, якая накіравана на іх захаванне і папулярызацыю. І абсалютна зразумела, чаму гэтая тэма ўзнікла на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў». Навукоўцы, якія сабраліся ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, — людзі апантаныя і зацікаўленыя кожны ў сваёй тэме, сферы ці відзе мастацтва. Больш за 190 чалавек з самых розных краін прынялі ўдзел у абмеркаванні праблем і стану сучаснай культуры. Было пра што паспрачацца, было што ўдакладніць. Але немагчыма было абмінуць галоўнае. Немагчыма было абысціся без размовы пра глебу, на якой узводзіцца прыгожы і складаны будынак сучаснай культуры; немагчыма нават пачынаць абмяркоўваць нешта такое, што прынесла з сабой XXI стагоддзе, без таго, што было задоўга да яго. Бо ва ўсім ёсць глеба, падмурак, аснова. Традыцыя...

Напрыклад, **Аляксандр МАКСЯШЫН, прафесар,** які прыехаў з Расіі, разважаў пра гэта так:

— Мінулае XX стагоддзе аказалася настолькі багатым і непрадказальным у дачыненні да новых стылёвых кірункаў, відаў, жанраў, а тым больш тэрмінаў. Напэўна, кожнаму з нас трэба быць талерантным, нармальна ўспрымаць і ставіцца да ўсяго новага пад уплывам розных цывілізацый і культур. Але не варта забываць і пра свае традыцыі, якія пакуль яшчэ падсілкоўваюць сучаснае грамадства, без якіх немагчымы каларыт любой нацыянальнай культуры і мастацтва.

